# «ЧАС НА АСАБІСТАЕ ЖЫЦЦЁ БЫЎ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А ў **старшыні савета дырэктараў ААТ«Амкадор» Аляксандра ШАКУЦІНА** быў выдатны настрой разам з нагодай пахваліцца на сустрэчы з калектывам і зборнай:

— Сёння ў нас некалькі выдатных падзей. Першая — прыезд нашых найлепшых спартсменаў да нас у госці. Ёсць і другая, гістарычная падзея — мы набылі завод у Бранску *(гучныя апладысменты калектыву ў зале)*.

Аляксандр Шакуцін падкрэсліў, што калі ў Расіі аб'ём вытворчасці ў машынабудаўнічым комплексе ў час крызісу зменшыўся на 70 працэнтаў, то яго прадпрыемства захавала 65 працэнтаў вытворчасці. Сродкі інвестуюцца ў стварэнне новых машын, за мінулы і гэты год «Амкадор» паставіў на вытворчасць 7 новых мадэляў тэхнікі.

**Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Юрый ШАЎЦОЎ** быў у больш песімістычным настроі:

— У нас у камандзе не ўсё так добра. Мы сёння прайгралі клубу «Няве», і мне сорамна за гэты вынік. Нас чакае вялікая праца, каб вывесці каманду на еўрапейскі ўзровень. Па фізічных кандыцыях мы адстаём ад еўрапейскіх зборных. Прызнаюся, што мне даволі цяжка кіраваць камандай — сёння на пляцоўцы, напрыклад, яна была ненадкантрольная.

Тым не менш, Юрый Шаўцоў падзяліўся планамі на будучыню. Учора нацыянальная зборная адбыла ў Галандыю, дзе правядзе два таварыскія матчы. Пасля беларускія гандбалісты накіруюцца ў госці да зборнай Германіі, а ў студзені каманда едзе на перадкваліфікацыйны турнір на Кіпр. У ім, акрамя беларусаў, возьмуць удзел каманды Кіпра, Фарэрскіх астравоў і Швейцарыі. Пераможца выходзіць у кваліфікацыю чэмпіянату свету 2011 года ў Швецыі. І не варта гаварыць, што менавіта такая задача цяпер стаіць перад нашай камандай.

Сяргей Гарбок таксама прызнаўся, што яму сорамна за некаторыя гульні каманды:

— Але пасля дажджу заўсёды з'яўляецца сонца. Нам трэба пабачыць усё горшае ў камандзе і выправіць памылкі.

Калектыў прадпрыемства цікавілі зусім не спартыўныя эпізоды з жыцця праслаўленых спартсменаў. У Сяргея Гарбока, якога Іван Семянене разрэкламаваў як і бацьку трох дачок-блізнят, спыталі пра яго распарадак дня, а дзяўчына пацікавілася, ці ёсць у гандбаліста час на асабістае жыццё.

— У Германіі я ўстаю вельмі рана, паколькі маю трое дзяцей. Калі дзяўчаты толькі нарадзіліся, я ўвогуле спаў не больш за тры гадзіны ў суткі. У дзесяць гадзін у мяне пачынаецца трэніроўка, потым абед, пасля ёсць гадзіна прагуляцца дзесці з жонкай. У 16.30 другая трэніроўка, пасля якой у 19 гадзін я свабодны, але вывучаю пэўныя аднаўленчыя мерапрыемствы для здароўя. Прыходжу дадому, калі дзеці ўжо спяць. Ёсць гадзіна на асабістае жыццё. Час на асабістае жыццё ўвогуле ёсць, праўда, да таго, як у цябе з'яўляецца трэнер, — пажартаваў гандбаліст.

Юрый Шаўцоў расказаў пра распарадак спартсменаў у нацыянальнай зборнай:

— У 7.20 у нас зарадка — 10-кіламетровая прабежка. Пасля сняданку — першая трэніроўка, яна займае дзве гадзіны. Пасля гэтага некаторыя гульцы выказваюць жаданне пазаймацца са штангай. Пасля абед, сон, тэарэтычныя заняткі. Затым вячэрняя трэніроўка і вячэра. Пасля яе я звычайна праводжу асабістыя гутаркі з гульцамі, — расказаў галоўны трэнер. І запрасіў калектыў прадпрыемства, асабліва жаночую яго палову, на адкрытую трэніроўку нацыянальнай зборнай. А старшыні савета дырэктараў Аляксандру Шакуціну, які з настальгіяй узгадаў поспехі беларускага гандбола тых часоў, калі гулялі сам Юрый Шаўцоў, Георгій Свірыдзенка, Аляксандр Каршакевіч, намеснік старшыні федэрацыі Іван Семянена прэзентаваў мяч з аўтографамі гульцоў. Разам са спадзяваннямі, што ў зборнай ёсць усе шанцы паўтараць колішнія поспехі беларускага гандбола — у студзені за нацыянальную зборную можа выступаць самы дарагі гандбаліст свету (сума яго трансферу ў «Барселону» склала 1 мільён еўра, а гадавая зарплата 240 тысяч еўра) Сяргей Рутэнка.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## Беларусь—Казахстан: супрацоўніцтва ва ўсіх сферах і на ўсіх узроўнях

**Напярэдадні ў Мінску прайшла Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Казахстан—Беларусь: вопыт гуманітарнага супрацоўніцтва і захавання міжнацыянальнай стабільнасці». У ёй узялі ўдзел дэпутаты Рэспублікі Казахстан, прадстаўнікі дзяржаўных органаў Беларусі, паслы дзяржаў — удзельніц СНД, акрэдытаваныя ў Мінску, навукоўцы дзвюх краін.**

На форуме закраналася шмат актуальных пытанняў, якія адлюстроўваюць стан і перспектывы фарміравання і развіцця агульнай духоўнай прасторы ў кантэксце сучасных выклікаў. Абмяркоўваўся стан і перспектывы казахстана-беларускіх гуманітарных сувязяў. Асаблівую ўвагу ўдзельнікі канферэнцыі надалі захаванню міжнацыянальнай стабільнасці. Як адзначыў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Казахстана ў Беларусі Анатоль Смірноў, культурна-гуманітарнае супрацоўніцтва дзвюх краін у апошнія гады значна актывізавалася. Сёлета шмат мерапрыемстваў праведзена ў Мінску пасольствам сумесна з Домам дружбы. «Па гэтым пытанні ў нас ёсць разуменне, — адзначыў Анатоль Смірноў, — мы як родныя душы з беларускім народам, брацкія краіны. Што датычыцца эканомікі — гэта таксама адзін з важных складнікаў нашых адносінаў. З улікам сусветнага фінансавага крызісу тавараразварот да ўзроўню мінулага года крыху зніжаны. Але сёння зноў ёсць тэндэнцыя да яго павелічэння. Самае галоўнае, што мы сёлета напрацавалі базу для будучага тавараразвароту.

Сёлета ўпершыню адбыўся афіцыйны візіт прэм'ер-міністра Казахстана ў Беларусь. Прэм'ер-міністр Беларусі быў у Казахстане двойчы. На сёння мы супрацоўнічаем ва ўсіх сферах. Важным штуршком у актывізацыі двухбаковых адносінаў будзе афіцыйны візіт Прэзідэнта Казахстана Нурсултана Назарбаева ў Беларусь, які плануецца на 25—26 лістапада, — падкрэсліў пасол.

**Святлана СУХАРКО.**

## ЗДАЎ ЗБРОЮ — ПАЗБЕГНУЎ АДКАЗНАСЦІ

УУС адміністрацыі Савецкага раёна г. Мінска паведамляе, што на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 8 гадзін 2 лістапада да 20 гадзін 6 лістапада 2009 года праводзяцца аператыўна-прафілактычныя спецыяльныя комплексныя мерапрыемствы «Арсенал». Асобы, якія добраахвотна здалі зброю, боепрыпасы, выбуховыя прыстасаванні і выбуховыя рэчывы, вызваляюцца ад адказнасці. Па пытаннях здачы звяртацца па тэлефонах: 2929058, 2929554, 2920202.

**ЗАО «Гастроном Особый»** уведомляет своих кредиторов об уменьшении Уставного фонда в связи с принятым решением внеочередного общего собрания акционеров. УНН 100868505

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «2010 ГОД ПАВІНЕН СТАЦЬ ЭТАПАМ АДНАЎЛЕННЯ ХУТКАГА ЭКАНАМІЧНАГА РОСТУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пётр Пракаповіч будзе каардынаваць дапрацоўку дакументаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2010 год.

Аляксандр Лукашэнка застаўся незадаволены падрыхтаванымі ўрадам дакументамі. «Гэтыя дакументы нікуды не годныя, — сказаў ён. — І не падыходзяць для таго, каб працаваць у будучым годзе напружана. Павінен быць адзін прагноз, адзін план грашова-крэдытнай палітыкі, зразумелы для народа».

Кіраўнік дзяржавы даручыў старшыні праўлення Нацыянальнага банка Пятру Пракаповічу і намесніку кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Леаніду Анфімаву ўзначаліць дапрацоўку гэтых дакументаў. «Пракаповіч, Анфімаў — вы галоўныя адказныя на працягу месяца падрыхтаваць усе дакументы на будучы год. Калі раней падрыхтуеце, будзе лепш. Усе рашэнні, прынятыя на трэцім Усебеларускім народным сходзе, няўхільна павінны быць выкананы», — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка.

Звяртаючыся да кіраўніка Нацбанка, Прэзідэнт сказаў: «Пётр Пятровіч, для вас гэта — максімум часу. Наймайце, прыцягвайце каго хочаце. Стаўце задачы разам. А кіраўнік Адміністрацыі павінен унесці мне гэтыя дакументы канчаткова».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка разглядае магчымасць кадравых перастановак ва ўрадзе.

Аляксандр Лукашэнка даручыў кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзіміру Макею ў найбліжэйшы час падрыхтаваць прапановы па кадравых рашэннях адносна членаў урада.

«Краіна жыве так, быццам крызісу ў краіне няма. На чым ездзілі — на тым і ездзяць, куды ездзілі — туды і ездзяць. Што елі — тое ядзім, што адзявалі — тое і адзяваем», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Ніхто яшчэ ў крызісе не жыў, акрамя народа, якому толькі і прапануюць то на 10 долараў, то на 5 павысіць плацяжы па камуналцы, — сказаў Прэзідэнт. — І не хадзіце да мяне і не прасіце: маўляў, давайце гэта павялічым, гэта ўзнімем. Шукайце шляхі зніжэння сабекошту. Працуйце над павышэннем прадукцыйнасці працы».

«Міністраў папярэджваю, што я пачаў асабіста і персанальна слухаць кожнага», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

«І папрашу губернатараў сур'ёзна заняцца сваімі тэрыторыямі. Пытанне нумар адзін — прамысловасць. Губернатары асабіста з заўтрашняга дня павінны ўзначаліць кампанію па разгрузцы складоў усіх прадпрыемстваў, — сказаў Прэзідэнт. — Няхай што хочуць робяць, але выходзяць на зададзены ўзровень. Або альтэрнатыва: не можаце — скажыце. Я буду шукаць іншых людзей, хто гэта змог бы. Але прынятыя мною рашэнні — закон для ўсіх, тут прысутных».

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

# ЗЯНОНУ ЛОМАЦЮ ПАСКАРДЗІЛІСЯ НА ЗАТРЫМКІ ЗАРОБКАЎ І РАЗЛІКАЎ ЗА МАЛАКО

**СТАРШЫНЯ Камітэта дзяржаўнага кантролю правёў 29 кастрычніка «прамую лінію» з жыхарамі Магілёўскай вобласці.**

Як і заўсёды, шмат тэлефанаванняў датычыліся **жыллёвых праблемаў і добраўпарадкавання.** Большая іх частка прыйшлася на Магілёў. Дапамогі ў старшыні Камітэта дзяржкантролю прасілі жыхары вуліцы Струшня, якія са сваімі хатамі сталі закладнікамі дажджлівага надвор'я і будаўніцтва каналізацыйнага калектара, якое зацягнулася. Людзі скардзяцца, што да іх дамоў цяпер не толькі немагчыма праехаць, але і дайсці пешшу складана.

Жыхары дома на вуліцы 30 гадоў Перамогі ў абласным цэнтры паведамілі: з-за праблем з дахам не толькі «плаваюць» у кватэрах, але і пазбавіліся бытавой тэхнікі, бо восеньскімі дажджамі залівае электрашчыты і лічыльнікі.

З вуліцы Пераезнай, што ў Крычаве, жанчына паскардзілася на дарогу. Насыпная дарога, па якой ездзяць цяжкія аўтацягнікі, вышэйшая за агароды: брудная жыжка цячэ з дарогі прама ў хаты, але шматгадовыя надзеі і абяцанні ўладаў выправіць сітуацыю не спраўджваюцца.

З адной з вёсак Магілёўскага раёна пацікавіліся: чаму не працуюць новы водапровод і калонкі, якія даўно ўсталяваныя? Навошта такія грошы выдаткавалі на новую сістэму водазабеспячэння, калі яна не працуе?

**З некалькімі скаргамі будзе разбірацца міліцыя.** З Клімавічаў патэлефанавала жанчына, якая расказала аб падмане: яе папрасілі падпісаць дакумент аб добраўпарадкаванні тэрыторыі навокал дзіцячага сямейнага дома, а потым адмовіліся хоць бы дарогу зрабіць: маўляў, крызіс, а асфальт дарагі...

Жыхарка Кіраўскага раёна з плачам расказала пра сітуацыю, у якую трапіла яе шматдзетная сям'я: атрымалі крэдыт на рамонт дома, але будаўнічая фірма надта мала зрабіла за вялікія грошы, на якія можна было і новы дом пабудаваць. Не выключана махлярства, таму да сітуацыі падключыцца міліцыя.

**Зянон Ломаць** расказаў журналістам, што «прамая лінія» ў Магілёве — трэцяя на гэтым тыдні, пасля Гомеля і Віцебска.

— Я адчуваю, што мясцовыя органы ўлады надаюць вялікую ўвагу сацыяльным праблемам, — параўнаў кіраўнік КДК. — З іншага боку, менавіта ў Магілёўскай вобласці паступілі пытанні пра **нявыплаты заробкаў.**

Чатыры тэлефанаванні з 36, і тым не менш — гэта сігнал трывогі. Акрамя заробкаў, на **затрымкі разлікаў за здадзенае малако** паскардзіліся жыхары Бялыніцкага і Горацкага раёнаў. У апошнім выпадку, расказалі на «прамой лініі» вяскоўцы, не толькі не плацяць з верасня, але ўжо і не збіраюць. На скаргі людзей на малочнае прадпрыемства нібыта адказваюць, што іх малако зусім не патрэбнае.

— Гэта бязладдзе! — пракаментаваў Зянон Ломаць. — Такога быць не павінна, мы разбяромся дэталёва. За малако павінны прадпрыемствы разлічвацца як мінімум 2 разы на месяц, і іншых падыходаў быць не можа.

На «прамую лінію» паступілі і два пытанні па **карупцыі,** якія стануць прадметам пільнага разгляду з боку праваахоўных органаў. А самым цікавым, амаль што анекдатычным, Зянон Ломаць назваў пытанне, якое паступіла на завяршэнне «прамой лініі» з Магілёва.

— Патэлефанавала жыхарка аднаго з дамоў на праспекце Дзімітрава, — расказаў старшыня Камітэта дзяржкантролю. — Новы дом: здадзены ў снежні мінулага года і цяпер засяляецца. Мінула 9 месяцаў ад здачы дома, але ў ім дасюль няма гарачай вады і **не працуе ліфт. У 10-павярховым доме!** Але самае цікавае, што жыллёва-будаўнічы кааператыў называецца «Ліфтавік» і сфарміраваны з супрацоўнікаў Магілёўскага завода ліфтавага машынабудавання. Няўжо кіраўніцтва прадпрыемства хоць з ліфтам сваім людзям не здолела дапамагчы?

Гэтае і іншыя пытанні, якія паступілі на «прамую лінію» ў Магілёве, спецыялісты дзяржкантролю праверыць. Асабіста **з Зянонам Ломацем размаўлялі 36 чалавек, 68 зваротаў прынялі аператары.** Зафіксавана болей за 7 тысяч спробаў датэлефанавацца.

— Увогуле **становішча на Магілёўшчыне, як і ў іншых абласцях, нармальнае,** — падвёў вынікі кіраўнік КДК. — Так, праблемы ёсць: трэба займацца дарогамі, вуліцамі, рэалізацыяй праграмы «Чыстая вада» і гэтак далей. Але не ўсё адразу. Безумоўна, хочацца, каб усё было цяпер і адразу. Але ідэальнага ў жыцці няма. Калі сёння нельга вырашыць праблемы, то гэта адбудзецца заўтра і паслязаўтра. Я мяркую, што **аблвыканкам і органы ўлады на месцах шмат робяць для таго, каб вырашаць жыццёвыя праблемы людзей.** І яны вырашаюцца.

**Ілона ІВАНОВА.**

НАЎЗДАГОН

# «З ПРАВЕРКАМІ БУДЗЕ ПАРАДАК»

**Старшыня Камітэта дзяржкантролю Зянон Ломаць** пра новую сістэму праверак:

— Праверкі — гэта пытанне, якое хвалюе многіх. Нядаўна кіраўнік дзяржавы падпісаў Указ № 510 «Аб удасканаленні кантрольнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь».

На КДК ускладзены функцыі каардынатара. Мы цяпер распрацоўваем нарматыўна-метадалагічныя дакументы. Задача наступная: да 15 снежня гэтага года ў рэспубліцы трэба распрацаваць і разгледзець **каардынацыйны план, дзе будуць закладзены ўсе планавыя праверкі ўсіх кантрольных органаў на першае паўгоддзе 2010 года.** Гэта вялікая праца.

Указ сапраўды ўпарадкуе кантрольную дзейнасць у рэспубліцы. Хадзіць на праверкі да індывідуальных прадпрымальнікаў усе, каму хочацца, ужо не будуць. **Калі будзе планавая праверка, суб'ект гаспадарання пра гэта будзе ведаць за паўгода.**

З іншага боку, пазапланавыя праверкі таксама будуць. Але і тут павінен быць парадак. Таму што ёсць розныя прыклады, асабліва ў прыватным бізнэсе, калі з канкурэнтных меркаванняў пачынаюць ананімна скардзіцца, насылаць непрыемнасці і выжываць. Таму — будзе парадак.

Камітэт дзяржкантролю за 9 месяцаў правёў на трацціну меней праверак, чым у мінулым годзе. А калі параўноўваць з папярэднімі гадамі, то ўвогуле напалову. Але выніковасць у нас вышэйшая. Мы ідзём правяраць толькі тады, калі маем аператыўную інфармацыю, што ў гэтага суб'екта гаспадарання ёсць парушэнні. І таму выніковасць нашых праверак — 100 %.

Аднак трэба папярэдзіць, калі нехта з суб'ектаў гаспадарання мяркуе, што яны будуць нешта нядобрае рабіць і ніхто не праверыць. Гэта памылка. Калі не сёння будуць выяўлены парушэнні, то ўсё роўна калі-небудзь гэта выплыве. КДК і праваахоўныя органы цяпер распачынаюць і расследуюць крымінальныя справы па незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці, ухіленні ад выплаты падаткаў па фактах 7-8-гадовай даўніны.

Таму я ўсім заўсёды кажу: **працуйце ў прававым полі, не парушайце законы!** А калі хочаце быць упэўненымі, што ў вас усё добра, то запрашайце спецыялістаў Камітэта дзяржкантролю. Прыйдуць і паглядзяць (дарэчы — бясплатна) — ці ўсё нармальна, ці адпавядае законам. Няхай суб'екты гаспадарання будуць законапаслухмянымі і тады ніякіх прэтэнзій да іх з боку кантрольных органаў не будзе.

**Запісала Ілона ІВАНОВА.**

# «Тэрмін прадпісання аб зносе самавольнага аб'екта будаўніцтва заканчваецца літаральна днямі...»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**— На агародзе сусед будуе станцыю тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў! Літаральна ў метры ад нашай агароджы з сеткі Рабіца ўжо заліты падмурак даўжынёй каля дзесяці метраў. Скажыце, пра якую экалогію тады можа ісці гаворка, пра якія чыстыя прадукты і паветра можна будзе гаварыць? Звярталіся мы з гэтай нагоды ў сельскі Савет, ды карысці ад таго ніякай, — з такой праблемай у рэдакцыю патэлефанавала жыхарка пасёлка Самахвалавічы Мінскага раёна Станіслава Антонаўна ШУША.**

Пражывае яна ў шматкватэрным пяціпавярховым доме па вуліцы Калініна. Калісьці даўно яго жыльцам выдзелілі ўчастак пад агароды. Дык побач з імі, расказвала жанчына, знаходзіцца дом на дзве кватэры, сын гаспадара адной з якіх і распачаў будоўлю на ўчастку.

Як мы высветлілі, яшчэ 30 верасня землеўпарадкавальнай і геадэзічнай службай Мінскага раёна гэтаму грамадзяніну было вынесена прадпісанне аб зносе гэтага аб'екта будоўлі. Тэрмін яго дзеяння заканчваецца літаральна на днях. Відавочна, з-за таго, што пакуль чалавек нічога не зрабіў для выканання палажэнняў гэтага дакумента, Станіслава Антонаўна і звярнулася ў рэдакцыю. Але, паўторымся, час у ініцыятара будаўніцтва, згодна з прадпісаннем, яшчэ ёсць, хоць яго засталося і няшмат. Тым не менш, мы паспрабавалі высветліць сітуацыю больш падрабязна. Няўжо грамадзянін сапраўды распачаў на ўчастку будаўніцтва станцыі тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў? З гэтым, у тым ліку, пытаннем звярнуліся да **старшыні Самахвалавіцкага сельскага Савета Уладзіміра ЛОКУНА.**

— Сцвярджаць, што на ўчастку вялося будаўніцтва менавіта станцыі тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў нельга, паколькі там пакуль быў заліты толькі падмурак. Аднак, мяркуючы па ім, гэта мог бы быць нейкі капітальны будынак. Што і з'яўляецца парушэннем, паколькі тут ужо можна гаварыць пра нямэтавае выкарыстанне зямельнага ўчастка. Апошні прызначаны для вядзення падсобнай гаспадаркі, таго ж агарода, пасля выдачы дазволу на ім можна было б узвесці нейкі часовы будынак для гаспадарчых патрэбаў, — распавёў Уладзімір Уладзіміравіч. — Гэты грамадзянін па адпаведны дазвол нікуды не звяртаўся, хоць павінен быў звярнуцца спачатку ў сельскі Савет, потым — у землеўпарадкавальную і геадэзічную службу раёна. Сама ж заліўка падмурка, можна меркаваць, адбылася ў вельмі сціслыя тэрміны — за дзень-два. Заўважыць будаўніцтва яшчэ цяжка было і з-за высокага плота.

Як паведаміў далей Уладзімір Локун, паколькі работы на ўчастку вяліся без дазволу, будаўніцтва лічыцца самавольным. Адпаведна, яго ініцыятар атрымаў прадпісанне аб зносе аб'екта. Пасля заканчэння тэрміну прадпісання на месца выедзе спецыяльная камісія з праверкай. Калі гаспадар пакіне ўсё як ёсць, зазначыў далей старшыня сельскага Савета, не выключана вырашэнне пытання ўжо ў судовым парадку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «БЕЛАРУСЫ ГІНУЦЬ НЕ АД «СВІНОГА» ГРЫПУ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі запэўнілі ў тым, што і аптэчная сетка краіны, і арганізацыі аховы здароўя забяспечаныя ў дастатковай колькасці неабходнымі лекавымі сродкамі, дыягнастычнымі тэст-сістэмамі і абсталяваннем для рэспіраторнай падтрымкі. У стацыянарах прадугледжана магчымасць для дадатковага разгортвання і перапрафілявання ложкаў. Ва ўсіх рэгіёнах і ў Міністэрстве аховы здароўя створаны рабочыя групы для аператыўнага кіравання сітуацыяй, аналізу і выпрацоўкі неабходных мераў. Аднак усім нам трэба і самім паклапаціцца пра сваю бяспеку. Роберт Часнойць заклікаў усіх беларусаў да нашэння масак: «Нашэнне маскі — вельмі важная прафілактычная мера, дзякуючы якой вы не інфіцыруеце ні сябе, ні іншых. А калі ўбачыце, што персанал нейкай медустановы цалкам перайшоў на нашэнне масак, не варта разглядаць гэты факт як падставу для панікі. Значыць, такое рашэнне было прынята на мясцовым узроўні ў прафілактычных мэтах...»

Сімптомы так званага «свінога» грыпу аналагічныя з сімптомамі сезоннага грыпу: гэта высокая тэмпература, мышачныя болі, галаўны боль, ліхаманка, дрыжыкі, слабасць, кашаль, боль у горле.

— У тым выпадку, калі высокая тэмпература працягвае трымацца на працягу некалькіх дзён і не адбываецца стабілізацыя сітуацыі, трэба тэрмінова выклікаць урача, — папярэджвае **начальнік аддзела першаснай медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла ЖЫЛЕВІЧ,** — бо гэта з'яўляецца трывожным сігналам, што да вірусу грыпу далучылася яшчэ нейкая інфекцыя, што, у сваю чаргу, пагражае сур'ёзнымі ўскладненнямі. Пнеўманія — адно з самых небяспечных ускладненняў грыпу. І яе ні ў якім разе нельга прапусціць. Як правіла, прычынай гібелі людзей ад пнеўманіі з'яўляецца позні зварот да медыкаў... І тым больш не варта выходзіць у працоўны калектыў адразу, як толькі вам удалося збіць тэмпературу, бо такі хворы рызыкуе і сам, паколькі ў яго можа развіцца ўскладненне на фоне грыпу, плюс ён уяўляе пагрозу для іншых. Мы зусім невыпадкова прадугледзелі, каб лісток непрацаздольнасці пры захворванні на вострую рэспіраторную інфекцыю, у тым ліку і на грып, выдаваўся адразу на 5 дзён.

Зразумела, што людзі ў працаздольным узросце з прычыны іх сацыяльнай актыўнасці і шматлікіх кантактаў у значна большай ступені рызыкуюць стаць ахвярамі новага вірусу грыпу, чым людзі немаладога ўзросту. Таму наведванне масавых мерапрыемстваў лепш адкласці на больш спрыяльны і бяспечны час. А калі ў калектыве адзін за адным пачалі хварэць калегі ці аднакурснікі, то не зашкодзіць прыём рэмантадзіну ў прафілактычных мэтах. Увогуле ў хатняй аптэчцы абавязкова павінен быць хоць адзін супрацьвірусны прэпарат!

**Наш кар.**

### ДА ВЕДАМА:

*Інкубацыйны перыяд грыпу доўжыцца ад 12 гадзін да 2-3 дзён, радзей (у маленькіх дзяцей) — да 5 дзён. Інфіцыраваны чалавек становіцца заразным ужо з першых гадзін захворвання і на працягу сямі сутак хваробы. Падчас чхання, кашлю, гутаркі вакол хворага ўтвараецца так званая «зона паражэння» радыусам 2-3 метры з максімальнай канцэнтрацыяй аэразольных часціц. Але часціцы здольныя разлятацца на адлегласць да 10 метраў. Пры гэтым вірусы грыпу застаюцца жыццяздольнымі на метале і пластмасе — на працягу 24-48 гадзін, на руках чалавека — на працягу 5 хвілін, у макроце — 2-3 тыдні, на паверхні шкла — да 10 сутак. Частае мыццё рук — вельмі эфектыўны спосаб прафілактыкі грыпу.*

## Абзац

◢ Іранскія інвестары выказалі жаданне пабудаваць пад мінскам турыстычную вёску ў персідскім стылі. Вёска павінна размясціцца на беразе Мінскага мора і ўключаць будынкі, што нагадваюць архітэктурныя пабудовы Старажытнай Персіі.

◢ **Невядомыя злачынцы абакралі ААТ «Даламіт», што размяшчаецца ў гарадскім пасёлку Руба пад Віцебскам. З тэрыторыі, якая ахоўваецца, позна ўвечары зламыснікі скралі 18 бураў. Кошт скрадзенага абсталявання ацэньваецца ў Br30,6 млн. Зладзеяў пакуль не ўдалося затрымаць. Па факце крадзяжу распачатая крымінальная справа.**

◢ Міліцыя расшуквае хулігана, які забрудзіў нафтапрадуктамі калодзежы ў Слуцкім раёне. Невядомы папсаваў ваду ў калодзежах двух пенсіянераў з вёсак Петкаўшчына і Мусічы. Шкодзіў хуліган па начах, выліваючы ў калодзежы, як мяркуецца, прадукты перапрацоўкі машыннага масла. Як гавораць відавочцы, на вадзе былі бачныя масляністыя разводы. Цяпер узоры вадкасці ўзятыя на экспертызу, якая дакладна вызначыць, чым забруджаная вада. Распачатая крымінальная справа.

◢ **За захоўванне грыбоў у дачыненні да мінчаніна распачатая крымінальная справа. Жыхар сталіцы 1989 г.н. захоўваў у сябе крыху больш за 3 грамы грыбоў карычневага колеру. Эксперты выявілі ў іх складзе псіхатропнае рэчыва псілабіцын. Аматару грыбоў пагражае да пяці гадоў пазбаўлення волі згодна з артыкулам КК Беларусі пра незаконны абарот наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і прэкурсораў.**

## Поўны абзац

◢ 96-гадовая жыхарка нямецкага горада Обердорф падчас прагулкі пешшу вырашыла скараціць шлях і дзеля гэтага паспрабавала перасячы аўтабан 81, які лічыцца адным з самых загружаных у Германіі. Жанчыне ўдалося пераадолець адну паласу, што ідзе ў кірунку Штутгарта. За гэты час у паліцыю паспелі пазваніць каля 20 уражаных вадзіцеляў з просьбай прыняць меры. Але другая паласа стала для бабулі непераадольнай: рух там быў намнога больш шчыльны. Адмовіўшыся ад беспаспяховых спробаў скараціць шлях, жанчына ў роспачы села на раздзяляльнай паласе. Там яна і была знойдзена паліцыяй, што прыбыла на месца здарэння. Пенсіянерку пасадзілі ў машыну і адвезлі туды, куды ёй было трэба. Варта нагадаць, што на нямецкіх аўтабанах няма абмежавання хуткасці, існуе толькі рэкамендаваная хуткасць: 130 км/гадз.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

**ЗАО «РРБ-Банк» сообщает, что 10 ноября 2009 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Краснозвездная, 18 состоится внеочередное Общее собрание акционеров Банка, которое собирается по инициативе Совета директоров Банка со следующей повесткой дня:**

1. Об увеличении уставного фонда ЗАО «РРБ-Банк» и об увеличении номинальной стоимости акций ЗАО «РРБ-Банк».
2. О внесении изменений в Устав ЗАО «РРБ-Банк».
3. Об изменении размера вознаграждения члену Совета Директоров.
4. О выплате промежуточного дивиденда по привилегированным акциям ЗАО «РРБ-Банк».

Всю необходимую информацию по вопросам повестки дня собрания можно получить в юридической службе ЗАО «РРБ-Банк» по **тел. 269 23 04.**

## Минский районный исполнительный комитет 1 декабря 2009 г. проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 | Лот 6 | Лот 7 | Лот 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Петришковский с/с, д. Новашино | Петришковский с/с, д. Новашино | Петришковский с/с, д. Щеки | Петришковский с/с, а.г. Петришки | Сеницкий с/с, а.г. Сеница, ул. Замковая | Сеницкий с/с, а.г. Сеница, ул. Западная | Сеницкий с/с, а.г. Сеница, ул. Вишневая | Сеницкий с/с, а.г. Сеница, ул. Парковая |
| 2 | Кадастровый номер | 623685707101000110 | 623685707101000155 | 623685710101000003 | 623685707601000136 | 623686605101000909 | 623686605101000910 | 623686605101000911 | 623686605101000912 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1734 га | 0,1524 га | 0,2004 га | 0,1995 га | 0,1364 га | 0,1500 га | 0,1500 га | 0,1500 га |
| 4 | Целевое назначение | для строительства и обслуживания жилого дома | для строительства и обслуживания жилого дома | для строительства и обслуживания жилого дома | для строительства и обслуживания жилого дома | для строительства и обслуживания жилого дома | для строительства и обслуживания жилого дома | для строительства и обслуживания жилого дома | для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 70 000 | 70 000 | 70 000 | 501 680 | 797 113 | 780 273 | 780 273 | 780 273 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 17 033 170 | 14 970 000 | 18 050 000 | 40 490 000 | 62 212 585 | 68 921 490 | 68 921 490 | 68 921 490 |
| 7 | Задаток (рублей) | 1 700 000 | 1 400 000 | 1 800 000 | 4 000 000 | 6 200 000 | 6 800 000 | 6 800 000 | 6 800 000 |

| | | Лот 9 | Лот 10 | Лот 11 | Лот 12 | Лот 13 | Лот 14 | Лот 15 | Лот 16 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Самохваловичский с/с, д. Слобода, участок № 118 (массив № 1) | Самохваловичский с/с, д. Слобода, участок № 119 (массив № 1) | Самохваловичский с/с, д. Слобода, участок № 128 (массив № 1) | Самохваловичский с/с, д. Слобода, участок № 117 (массив № 1) | Самохваловичский с/с, д. Слобода, участок № 141 (массив № 1) | Самохваловичский с/с, д. Белица | Самохваловичский с/с, д. Русиновичи | Ждановичский с/с, п. Ратомка |
| 2 | Кадастровый номер | 623686304601000423 | 623686304601000418 | 623686304601000420 | 623686304601000419 | 623686304601000415 | 623686300601000136 | 623686303101000142 | 623681708601002496 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1920 га | 0,1898 га | 0,1450 га | 0,1628 га | 0,1551 га | 0,1300 | 0,1500 га | 0,1658 га |
| 4 | Целевое назначение | для строительства и обслуживания жилого дома | для строительства и обслуживания жилого дома | для строительства и обслуживания жилого дома | для строительства и обслуживания жилого дома | для строительства и обслуживания жилого дома | для строительства и обслуживания жилого дома | для строительства и обслуживания жилого дома | для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 765 610 | 765 610 | 765 610 | 765 610 | 765 610 | 755 980 | 755 980 | Включены в начальную цену |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 19 084 800 | 18 866 120 | 14 413 000 | 16 182 320 | 15 416 940 | 8 153 600 | 8 736 000 | 75 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 1 900 000 | 1 800 000 | 1 400 000 | 1 600 000 | 1 500 000 | 800 000 | 800 000 | 7 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 307. Дата проведения: **1.12.2009 г. в 9.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9:00 до 17:00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов 25.11.2009 г. Контактный телефон: (8 025) 92 761 92.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1, 2, 3, 4 перечисляется на расчетный счет Петришковского сельисполкома № 3600621130151 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, код 520, УНН 600052386;

На Лоты 5–8 – на расчетный счет Сеницкого сельисполкома № 3600621160189 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052409, ОКПО 04432966, код платежа – 04901.

На Лоты 9–15 – на расчетный счет Самохваловичского сельисполкома № 3600621150173 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052424 ОКПО 04430482, код платежа – 05520.

На Лот 16 – на расчетный счет Ждановичского сельисполкома № 3600621030059 ГУ МФ РБ по Минской области (УНК 103), ф-л № 614 АСБ «Беларусбанк», код 520, УНП 600537220, назначение платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Аукцион организуется и проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь, утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.

По решению комиссии участники аукциона, не выигравшие аукцион в отношении земельных участков, на которые они подали заявления, в перерывах между аукционными торгами могут перерегистрироваться на другие земельные участки, по которым размер задатка не превышает суммы, внесенной ими в качестве ранее перечисленного задатка. Для перерегистрации участники аукциона представляют заявления.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона. (В этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении ему земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин, юридическое лицо обязаны внести плату за земельный участок в размере его кадастровой стоимости, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
2. заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);
- представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность.

# Краіна здароўя

Выпуск № 45 (159)

Лечымся без лекаў

# Галасок ВАШ не гучыць?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Такое здараецца і здараецца нярэдка, асабліва ў халодную пару года. Удзень чалавек нармальна гаварыў, а вечарам здольны выдаць толькі сіплы шэпт ці незразумелае булькатанне. Прапаў голас. Пры гэтым ніякіх прыкметаў прастуды не назіраецца.*

*Звычайна падобная напасць праследуе тых, хто па родзе сваёй дзейнасці вымушаны шмат і доўга гаварыць: выкладчыкаў, артыстаў, дыктараў і г.д. Ад перанапружання галасавых звязак голас спачатку садзіцца, а потым і зусім прападае. Нягледзячы на адсутнасць тэмпературы, галаўнога болю, кашлю, усё-такі гэта хвароба, якая называецца ларынгіт — запаленне слізістай абалонкі гартані. Як жа лячыць яе? Паспрабуйце ўжыць хатнія сродкі.*

● Для хуткага аднаўлення голасу: дробна парэжце кавалачак хрэну велічынёй з лясны арэх, заліце яго 1/3 шклянкі гатаванай вады і патрымайце пад накрыўкай хвілін 20. Дадайце крыху цукру, размяшайце і піце на працягу дня па 1 ч. лыжцы ў гадзіну.

● Добры сродак пры частых ларынгітах — келіх падагрэтага піва (не халоднага і не гарачага, а менавіта цёплага!). У піва можна дадаць 2—3 ст. лыжкі малака або 1 ст. лыжку мёду. Напой праграvae горла, паляпшае ў ім мікрацыркуляцыю крыві і вымушае клеткі працаваць актыўней, хутчэй спраўляцца з запаленнем.

● Паўшклянкі пладоў анісу заліць шклянкай вады, кіпяціць 15 хвілін, крыху астудзіць і працадзіць. Дадаць прыкладна чвэрць шклянкі ліпавага мёду і яшчэ раз пракіпяціць. Зняць з агню, уліць 1 ст. лыжку каньяку. Прымаць па 1 ст. лыжцы кожныя паўгадзіны.

● Мякаць паловы лімона здрабніць, дадаць 1 ст. лыжку мёду, патрымаць сумесь у роце, затым праглынуць.

● У роўных прапорцыях змяшаць гарэлку, мёд і лімонны сок. Выпіць чарку гэтага цягучага напою — павольна, затрымліваючы ў роце. (Улічыце, што і мёд, і лімон, і гарэлка — алергены, таму рэцэпт варта прымяняць, толькі калі вы ўпэўненыя, што ў вас няма павышанай адчувальнасці да іх.)

● Альбо прыгатуйце «кактэйль Шаляпіна», куды ўваходзяць каньяк, лімонны сок, мёд і яйка (усіх кампанентаў трэба браць пароўну), і выпіце яго залпам.

● Ад хрыпаты пазбаўляе яблыневы ліст, высушаны ў цёмным месцы. Жменьку лісця заварыць 2 шклянкамі кіпеню, настойваць 2 гадзіны, працадзіць. Настой піць цёплым, з цукрам, па 0,5 шклянкі кожныя 2 гадзіны.

● Пры сіплым голасе дапамагае і адвар каліны: 1 шклянку пладоў заліць 1 літрам вады, кіпяціць 10 хвілін на слабым агні, працадзіць, дадаць 2—3 ст. лыжкі мёду. Піць па 1/2 шклянкі 3 разы на дзень.

**ПРАФІЛАКТЫКА**

● Каб загартаваць горла і ўмацаваць галасавыя звязкі, трэба хоць бы на працягу месяца паласкаць горла наступным саставам. Кветкі рамонку аптэчнага, лісце эўкаліпту і кветкі наготак змяшаць у роўных прапорцыях. Узяць 1 ст. лыжку гэтай сумесі, заліць яе 300 мл гатаванай вады і кіпяціць 2 хвіліны, пасля чаго настойваць на працягу 40 хвілін, добра ўхутаўшы, і працадзіць.

Паласкаць горла 2 разы на дзень, раніцай і вечарам, падзяліўшы настой папалам. Кожны дзень гатаваць свежы настой. Пачынаць паласканне настоем з тэмпературы 26 градусаў, паступова зніжаючы тэмпературу кожны дзень на 1 градус. Дайшоўшы да тэмпературы 14—16 градусаў, у наступныя дні паласкаць горла настоем толькі такой тэмпературы.

● Для здаровага голасу, як і для ўсяго арганізма ў цэлым, таксама мае значэнне, чым мы харчуемся. Тым, каму даводзіцца ў сувязі з прафесіяй або з-за іншых абставінаў шмат гаварыць, перш-наперш трэба выключыць з рацыёну ўсё, што дрэнна ўплывае на галасавыя звязкі. Так, для голасу шкодная вострая, кіслая, салёная, вельмі халодная або гарачая ежа, якая раздражняе слізістую абалонку. Калі вам трэба будзе шмат гаварыць, напрыклад, вы рыхтуецеся да выступлення або лекцыі, пастарайцеся не есці арэхі, семкі, чыпсы, пячэнне (усё, што крышыцца), не піць газаваныя напоі. А таксама запомніце, што ежу лепш прымаць за 2—3 гадзіны да пачатку выступлення. Інакш перапоўнены страўнік будзе ціснуць на дыяфрагму і перашкаджаць правільнаму дыханню.

● Пастарайцеся не дапускаць перанапружання галасавога апарату: безупынна гаварыце не больш як 2 гадзіны, а затым абавязкова зрабіце паўзу. Менш размаўляйце ў памяшканнях, дзе накурана. Нельга адразу ж пачынаць гаварыць, увайшоўшы ў цёплае памяшканне з холаду, лепш памаўчаць нейкі час. І ўжо тым больш шкодна крычаць на холадзе, таму што паветра не паспявае сагрэцца і пераахалоджвае слізістую гартані.

● Манатонная прамова хутчэй стамляе галасавыя звязкі. Таму гаварыць трэба дынамічна — мяняць інтанацыі, то паніжаючы, то павышаючы голас, выдзяляючы патрэбныя словы націскам.

● Давайце адпачыць сваім звязкам. Поўнае маўчанне — гэта лепшае з таго, што вы можаце зрабіць для свайго голасу. Ва ўсякім разе пазбягайце крайнасцяў — шэпту або крыку.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Лечымся без лекаў

# КАЛАНХОЭ: і прыгожае, і карыснае

***Што мы ведаем пра каланхоэ?***

● Род каланхоэ налічвае каля 200 відаў. Адны з іх багата і даволі доўга цвітуць яркімі кветкамі рознай афарбоўкі. Другія прыцягваюць увагу незвычайнымі формамі сваіх сцёблаў і лісця. Самыя распаўсюджаныя ў нас віды — каланхоэ перыстае і каланхоэ Дэгрэмона.

● Гэту прыгожую расліну вырошчваў вялікі нямецкі паэт Гётэ і лічыў, што яна здольная абараніць ад многіх хваробаў. Ды і ў нас здаўна ведалі пра яе лекавыя ўласцівасці. Вучоныя даказалі, што сок каланхоэ ахоўвае нас ад мікробаў, вірусаў, добра загойвае раны, спыняе крывацёк. І ўсё гэта дзякуючы прысутным у ім флаваноідам, дубільным рэчывам, вітамінам С і Р, макра- і мікраэлементам (алюміній, жалеза, магній, медзь, крэмній), арганічным кіслотам (яблычная, лімонная, воцатная), а таксама розным ферментам.

● Расліна незаменная для людзей, якія раніцай зведваюць прыступы дрэннага настрою і ніяк не могуць узяцца за працу. Мяккая энергетыка каланхоэ дапаможа падняць жыццёвы тонус. Дастаткова пасядзець каля расліны паўгадзіны, і вы адчуеце прыліў сілаў.

***З карысцю для здароўя***

● Калі ў вас насмарк, закапайце некалькі кропель свежага соку каланхоэ ў кожную ноздру, і цяжкасцяў з дыханнем як і не было. Можна таксама змазваць свежым сокам слізістую носа 2—3 разы на дзень.

● Парэзаліся? Прамыйце лісцік каланхоэ халоднай вадой, злёгку падрапайце скурку чыстым нажом, каб выдзеліўся сок, і прыкладзіце да ранкі, яна загоіцца нашмат хутчэй.

● Адолела пякотка? З'ешце невялікі лісцік гэтай расліны. Праз 3—5 хвілін пякоткі і след прастыў.

● Пры зубным болі прамыйце лісцік, пажуйце яго і патрымайце 15—20 хвілін каля хворага зуба, боль сціхне.

● Калі вы пакутуеце ад язвы страўніка, прымайце па 1 ч. лыжцы соку каланхоэ 3 разы на дзень.

● Пры аслабленым імунітэце лісце каланхоэ карысна есці. Яны ачышчаюць кроў, нейтралізуюць шкодныя рэчывы і дапамагаюць засцерагчыся ад прастуды. Іх можна дадаваць у вінегрэты і бульбяныя салаты.

Лекавыя салаты рэкамендуюцца і тым, хто пакутуе ад парадантозу або запалення дзяснаў. У дробна нарэзанае лісце каланхоэ дадаць крыху алею і 2 ч. лыжкі ліможнага соку. Такія салаты дабратворна ўплываюць на слізістую абалонку рота, змяншаюць запаленне і кроватачывасць дзяснаў.

● Пры ангіне палашчыце горла некалькі разоў на дзень сокам каланхоэ, разведзеным вадой (1:1).



**Парада:** каб прыгатаваць сок, зрэжце лісце са сцёбламі, старанна прамыйце і пакладзіце на 5—7 дзён у цёмнае халаднаватае месца. Затым прапусціце праз мясарубку, адцісніце сок, дайце яму адстаяцца. Пасля таго, як унізе збярэцца зялёны асадак, верхнюю празрыстую частку зліце і дадайце да яе прыкладна 1/4 частку спірту. Захоўвайце ў слоіках з герметычнай накрыўкай пры тэмпературы не вышэй 10 °С на працягу года.

● Пры варыкозным расшырэнні венаў на нагах прыгатуйце настойку: напоўніце слоік (0,5 л) дробна нарэзаным лісцем каланхоэ і заліце гарэлкай даверху, шчыльна накрыйце, настойвайце тыдзень у цёмным месцы. Націрайце ногі настойкай на ноч, кругавымі рухамі, пачынаючы са ступняў. Курс лячэння — 2—3 месяцы.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Што пакінеш пасля сябе?

# ШАКАЛАДКА ДЛЯ МІНІСТРА, альбо Ацэнка дзяржаўнага плана. Экалагічная

## *Навошта і каму яна патрэбная, хто і як павінен яе праводзіць*

**У гэтым напрыканцы мінулага тыдня разбіраліся каля 50 беларускіх спецыялістаў самых розных сфераў падчас семінара-трэнінгу ў рамках праекта Еўрапейскага саюза і Праграмы развіцця ААН «Пабудова патэнцыялу ў галіне Стратэгічнай экалагічнай ацэнкі (СЭА) і рэалізацыі прыродаахоўных канвенцый у Беларусі».**

Тэма для нашай краіны новая, але не зусім. Ва ўсякім разе — цікавая. І карысная. Пра гэта сведчыла не толькі атмасфера на семінары, але і жывыя размовы падчас перапынкаў і дарогі ў РГК «Сілічы», дзе праходзіла практычнае навучанне, і назад. Спецыялісты і навукоўцы з 13 міністэрстваў і ведамстваў, некалькіх даследчых і праектных інстытутаў і ВНУ (горадабудаўнікі, камунальнікі, медыкі, эколагі, транспартнікі, эканамісты, выратавальнікі і інш.) знаёміліся паміж сабой, дзяліліся меркаваннямі і пагаджаліся, што Стратэгічная экалагічная ацэнка — рэч патрэбная і ў Беларусі рана ці позна павінна з'явіцца.

Размова ідзе пра незалежную і празрыстую ацэнку разнастайных дзяржаўных праграм, галіновых палітык і планаў з пункту погляду наступстваў для экалогіі і здароўя людзей. Напрыклад, нацыянальных праграм развіцця энергетыкі, транспарту, турызму, прамысловасці і інш.

— Нешта падобнае ў нас ёсць, — лічыць **галоўны спецыяліст аддзела турысцка-рэкрэацыйных прыродных тэрыторый і аховы навакольнага асяроддзя Беларускага навукова-даследчага інстытута праектавання горадабудаўніцтва Валянціна АЙСІНА**. — Напрыклад, тое, што робіць наш Інстытут — схемы комплекснай тэрытарыяльнай арганізацыі краіны, абласцей, генеральныя планы раёнаў, гарадоў — усё гэта праходзіць экалагічную і міжведамасную экспертызы, і ўсё гэта — стратэгія, бо размова ідзе не пра канкрэтныя аб'екты, а пра кіраванне развіцця тых альбо іншых тэрыторый. Больш за тое, эколагі працуюць над праектамі, генпланамі, схемамі з самага пачатку, практычна — у адной камандзе з праекціроўшчыкамі.

Праўда, абмеркаванне з грамадскасцю — адзін з прынцыпаў Стратэгічнай экалагічнай ацэнкі — тут не заўсёды бывае магчымым, прызнала спецыяліст. Пра падобныя праекты, лічыць яна, могуць меркаваць толькі прафесіяналы. Калі б грамадскасць прадстаўлялі эксперты, тады можна было б з імі і абмяркоўваць генпланы з карысцю для справы. А «цётка Клава» з лаўкі ля пад'езда здольная меркаваць толькі як спажывец.

Аднак гэта — у горадабудаўніцтве. Што датычыцца ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе, якая з'яўляецца абавязковай у нашай краіне, яна праводзіцца падчас праектавання канкрэтнага аб'екта і толькі ў дачыненні да канкрэтнай гаспадарчай дзейнасці, праходзіць пры рэканструкцыі альбо пашырэнні аб'екта, і далёка не заўсёды такую ацэнку можна назваць стратэгічнай.

Так, без дазволу эколагаў у Беларусі немагчыма пачаць выдаткоўваць грошы на рэалізацыю праекта ў прынцыпе. А вось Нацыянальныя праграмы і планы экалагічную ацэнку, тым больш стратэгічную, у нас не атрымліваюць зусім. А гэта было б вельмі карысна, лічаць замежныя эксперты.

— Стратэгічная экалагічная ацэнка дазваляе павялічыць якасць праграм і планаў, бо разам з распрацоўшчыкамі, паралельна альбо сумесна, працуе каманда незалежных сертыфікаваных экспертаў, якія яшчэ на стадыі падрыхтоўкі праграмы пралічваюць усе магчымыя адмоўныя наступствы пры яе рэалізацыі — патлумачыў **міжнародны эксперт Марцін СМУТНЫ, дырэктар кансалтынгавай кампаніі «Integra» (Чэхія)**. Па яго словах, у Чэхіі штогод на нацыянальным узроўні ажыццяўляецца каля 20 СЭА і яшчэ каля сотні — на рэгіянальным. Эксперты не толькі даюць сваё заключэнне, але і прапануюць меры па змякчэнні негатыўных наступстваў альбо іх прадухіленні. — Да таго ж Стратэгічная экалагічная ацэнка мае на ўвазе шматлікія кансультацыі, сумесны пошук рашэнняў, нярэдка міжнародны дыялог, грамадскае абмеркаванне, празрыстасць, што ў выніку павышае давер насельніцтва. Усё гэта дазваляе папярэдзіць дарагія і адчувальныя для дзяржавы памылкі.

Першая спроба правесці такую ацэнку ў Беларусі была зроблена некалькі гадоў таму пры распрацоўцы Нацыянальнай праграмы развіцця турызму.

— Толькі падчас канкрэтнай работы можна адчуць розніцу паміж тым, што ў нас і ёсць, і тым, што мае на ўвазе Стратэгічная экалагічная ацэнка, — падзялілася вопытам **нацыянальны эксперт Ірына ЗАСЦЕНСКАЯ, намеснік дырэктара па навуковай рабоце Рэспубліканскага НПЦ гігіены**. — Напрыклад, адна з мэтаў Праграмы развіцця турызму — павелічэнне патоку турыстаў у нашу краіну. Стратэгічная экалагічная ацэнка павінна даць заключэнне пра тое, як гэта можа паўплываць на нашу прыроду і на якасць жыцця людзей. Быццам бы нічога кепскага няма ў тым, што ў Нясвіж з яго 14 тысячамі жыхароў штогод будуць прыязджаць 10 тысяч турыстаў. Аднак гэта азначае, што ў невялікім горадзе прыкметна павялічыцца колькасць зваротаў у паліклінікі, колькасць пакупнікоў у крамах, паток аўтамабіляў на дарогах і г.д. Таму група экспертаў прапанавала распрацоўшчыкам праграмы прадугледзець адаптацыю паліклінік, гандлёвай і транспартнай сеткі горада. Эксперты вызначылі таксама два моцна адмоўныя ўздзеянні Праграмы: пагаршэнне атмасфернага паветра (з-за развіцця і інтэнсіўнага выкарыстоўвання аўтамабільных дарог) і змяншэнне біяразнастайнасці ў нашай краіне.

Не ўсе прапановы экспертаў былі ўлічаныя Міністэрствам спорту і турызму, але некаторыя немалаважныя былі ўсё ж такі ўзятыя пад увагу. Так, напрыклад, у Праграму развіцця турызму, дзякуючы праведзенай Стратэгічнай экалагічнай ацэнцы, былі ўнесены змяненні, якія датычыліся асабліва ахоўных тэрыторый, у прыватнасці Бярэзінскага біясфернага запаведніка. Аднак калі ў нашай краіне Стратэгічная экалагічная ацэнка атрымае адлюстраванне ў заканадаўстве, ігнараваць заключэнне экспертаў будзе праблематычна.

Для гэтага, зразумела, патрэбна вялікая папярэдняя работа. Ацэнка Праграмы па развіцці турызму і семінары ў Сілічах (падобных прадугледжана яшчэ чатыры) — пачатковыя крокі на гэтым шляху. Калі Ірына Засценская казала пра ўрокі і вынікі першага вопыту Стратэгічнай экалагічнай ацэнкі ў Беларусі, яна звяртала ўвагу на тое, што планаванне праграм у нас адбываецца вельмі хутка — на працягу 2 месяцаў пасля адпаведнага ўказання. За гэты тэрмін правесці Стратэгічную экалагічную ацэнку немагчыма. Яна патрабуе, па меркаванні беларускіх экспертаў, сама мала — паўгода (у Вялікабрытаніі сярэднія выдаткі для адной СЭА 70—80 чалавекадзён, у Чэхіі на адну Ацэнку патрабуецца 40—65 дзён, але можа быць і два гады — столькі, колькі доўжыцца працэс планавання). У той жа час надзвычай важна, каб эксперты прапанавалі сваё заключэнне распрацоўшчыкам як мага раней, пакуль праграма яшчэ не зацверджаная. Толькі тады рэальна ўнесці ў яе нейкія змяненні. Неабходныя метадычнае забеспячэнне, падрыхтаваныя эксперты, кампетэнтнасць грамадскіх арганізацый, зацікаўленасць чыноўнікаў...

Дарэчы, пытанне, як зацікавіць распрацоўшчыкаў праграмы ў тым, каб яны звярнуліся па экспертную групу (а значыць заплацілі ёй, далі час і ўлічылі рэкамендацыі) — вельмі хвалявала беларускіх спецыялістаў. Сутнасць у тым, што Стратэгічная экалагічная ацэнка — гэта не дазваляльны орган, не інструмент для прыняцця рашэння, а інструмент для прыняцця больш правільнага рашэння. Яе мэта — палепшыць якасць той ці іншай праграмы, а не забараніць альбо дазволіць. Аднак як матываваць палітычных і грамадскіх дзеячаў, высокапастаўленых чыноўнікаў звяртацца па гэты інструмент? Нехта з удзельнікаў семінара выказаў меркаванне, ці не выкарыстаць у якасці матыву шакаладку.

— Можна, вядома ж, і шакаладку, а лепей — бутэльку добрага віна, — адказаў жартам на жарт **міжнародны эксперт Міхал МУСІЛ**, які асабіста ўдзельнічаў у больш чым 20 паўнавартасных праектах па Стратэгічнай экалагічнай ацэнцы ў краінах Усходняй Еўропы. — А калі сур'ёзна, сапраўды, існуе праблема матывацыі распрацоўшчыкаў праграм і планаў. У Чэхіі, напрыклад, яна забяспечваецца на заканадаўчым узроўні. Аўтары праграмы павінны сама мала — прачытаць справаздачу па Стратэгічнай экалагічнай ацэнцы. Таму вельмі важна, каб заўвагі экспертаў былі слушнымі і прымальнымі, а выкананне рэкамендацый — магчымым. Не трэба факусавацца на негатыўных уздзеяннях, лепш — узмацніць пазітыўныя.

Усе ўдзельнікі семінара ў Сілічах пагадзіліся, што элементы Стратэгічнай экалагічнай ацэнкі могуць быць уключаныя ў існую сістэму аховы навакольнага асяроддзя і здароўя людзей у Беларусі, і што гэта дазволіць дасягнуць агульнага павышэння эфектыўнасці гэтай сістэмы.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**



Сам сабе псіхолаг

# Калі трэба трымаць рот на замку?

**ЯЗЫК — вораг наш. Як часта мы трапляем у няёмкія сітуацыі з-за таго, што своечасова не прамаўчалі, кагосьці раскрытыкавалі, перабілі, павысілі голас... Жыццё паказвае, што існуе шэраг тэм, пры абмеркаванні якіх лепш памоўчваць або выказвацца вельмі карэктна і стрымана. Сёння мы іх і разгледзім. Такім чынам, трымайце язык за зубамі, калі гаворка заходзіць пра:**

● нацыянальнасці. Вы не можаце ведаць дакладна, хто ваш суразмоўца па нацыянальнасці. І ваша неасцярожнае выказванне можа зняважыць яго. Нават калі вы нецярпімыя да якой-небудзь нацыянальнасці, лепш пакінуць агрэсіўныя і рэзкія словы пры сабе.

● палітыку. Людзі розных палітычных поглядаў нярэдка становяцца ворагамі: сусед непаважае суседа, брат не размаўляе з братам... І ўсё гэта з-за спрэчак вакол палітыкі. Тут ужо дакладна лепш памоўчваць. Бо нервы і сямейны спакой нашмат даражэйшыя, чым нікому не патрэбныя спрэчкі.

● начальства. «Высмейванне кім-небудзь тваіх босаў (калі няма неабходнасці і магчымасці змясціць іх) выслухоўвай з каменным тварам» (Кім Філбі, легендарны савецкі разведчык). Перш чым самім пакрытыкаваць каго-небудзь, запытайцеся ў сябе: вы змаглі б даказаць справядлівасць вашых слоў у судзе? Вы маглі б паўтарыць тое, што збіраецеся сказаць, па радыё? А па тэлебачанні? А што, калі ваша размова ў падрабязнасцях, з маляўнічымі дабаўкамі стане вядомай (а ў большасці выпадкаў так яно і здараецца) таму, каго вы праціраеце з пясочкам? Выснова: калі не можаце сказаць нічога добрага пра чалавека, лепш прамаўчыце.

● знешнасць, разумовыя здольнасці, характар суразмоўцы. «Я не вельмі худая?» — напрыклад, пытаецца ў вас асоба жаночага полу, якая пры росце 170 важыць 48 кг. «Ты не проста худая, ты кашчавая!» — хочацца вам адказаць. І не бегайце потым за ёю — калі яна пакрыўдзіцца на ваш шчыры адказ — з прабачэннямі: «Ты ж сама прасіла сказаць праўду!». Вашы адносіны наўрад ці застануцца ранейшымі. Таму лепш пазбягаць падобных прамалінейных выказванняў.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

# ФУТБОЛ У ЛЕПЕЛІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# АСАБЛІВАСЦІ ПЕРМАНЕНТНАГА МАКІЯЖУ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Перманентны макіяж — адна з найбольш запатрабаваных працэдур сучаснай эстэтычнай медыцыны. Але кожнага, хто настроены на такую міні-аперацыю, ахоплівае цалкам абгрунтаванае хваляванне, ці не небяспечная яна для здароўя? Ці ёсць у яе супрацьпаказанні? На што ў першую чаргу звярнуць увагу чалавеку, які рашыўся на гэты спосаб упрыгажэння свайго твару або цела? Вось што раяць на гэты конт касметолагі...**

Не варта давяраць уласны твар «спецыялісту», які закончыў двухтыднёвыя або, у лепшым выпадку, трохмесячныя курсы. Або ўрачу, касметолагу, нават татуіроўшчыку па целе, які вырашыў «заадно» выконваць перманентны макіяж. Майстар перманентнага макіяжу, які стварае прыгажосць, павінен быць не толькі прафесійным татуіроўшчыкам, не толькі візажыстам, але і мастаком. Не толькі ўмець памераць твар лінейкай і па шаблоне вызначыць «ідэальную» форму броваў або вуснаў, але і знайсці такую, якая сапраўды ўпрыгожыць твар, падкрэсліць яго індывідуальнасць.

Напрыклад, працуючы з бровамі, трэба ўлічваць, як дзяўчына звычайна фарбуе вочы, ці носіць яна акуляры, як будзе выглядаць выбраны колер, калі яна вырашыць перафарбаваць валасы... А якімі бровы стануць праз некалькі гадоў? Нюансаў вельмі шмат. Аднак усе яны прадказальныя, таму калі вы звярнуліся да прафесіянала, рызыка няўдачы мінімальная.

Будзьце прыдзірлівымі пры выбары салона, атрымайце рэкамендацыі і пераканайцеся, што вы трапілі да спрактыкаванага візажыста. Калі ёсць магчымасць, пазнаёмцеся з ужо гатовымі работамі. Не саромейцеся спытаць, «на кім» маюцца вынікі творчасці майстра і як іх можна паглядзець.

Працэдура пачынаецца з абмеркавання формы вуснаў, вачэй, броваў і падбору колеру. Натуральна, што пры гэтым майстар з вышыні свайго досведу дае парады, дапамагае выбраць аптымальны варыянт, але канчатковае рашэнне, вядома ж, застаецца за вамі. (Дарэчы, акрамя прафесіяналізму майстра, многае таксама залежыць ад якасці абсталявання і пігментаў, якія выкарыстоўваюцца. Само сабой зразумела і захаванне правілаў гігіены і дэзынфекцыі ў кабінетах і непасрэдна пры правядзенні працэдуры.)

Не палохайцеся, калі ўзяты для работы пігмент ярчэйшы за жаданы. Бо пасля поўнай рэгенерацыі прафарбаванага ўчастка ён на 30—40 працэнтаў бляднее. Да таго ж пасля аднаўлення слою эпідэрмісу (прыкладна 0,5—0,8 мм), пігмент, прасвечваючыся праз яго, страчвае цёплыя адценні і становіцца больш халодным за кошт спектральнага праламлення.

Каб колер заставаўся натуральным, у гатовыя пігменты дадаюць так званыя спектральныя стабілізатары колеру, якія, на жаль, выпускаюцца вельмі нямногімі лабараторыямі. Напрыклад, чорны колер заўсёды будзе пераходзіць у сіні, таму ён выкарыстоўваецца выключна для падводкі вачэй, дзе эпідэрміс найбольш тонкі і праламленне мінімальнае. А карычневыя адценні могуць змяняцца да бардовых у вобласці броваў. У гэтыя пігменты спецыяльна дабаўляюць аліўкавы колер, які паглынаецца скурай.

Для работы ў вобласці вуснаў выкарыстоўваецца ўся гама чырвона-карычневых і слівава-ружовых тонаў. Для іх характэрнае змяненне ў халоднае бэзава-сіняе адценне. Каб папярэдзіць такі эфект, колер пігменту зводзіцца да аранжавага спектра.

Пры падрыхтоўцы да працэдуры перманентнага макіяжу цяпер выкарыстоўваюцца два віды анестэзіі. Гэта ін'екцыйная праваднікова анестэзія, што прымяняецца пры рабоце на вуснах, і аплікацыйная мясцовая анестэзія спецыяльным крэмам пры рабоце на бровах і вачах, што дазваляе зрабіць працэдуру максімальна камфортнай як для кліента, так і для майстра. Ін'екцыйная анестэзія выгадна адрозніваецца ад аплікацыйнай якасцю і пачаткам свайго дзеяння. Абязбольвальны эфект наступае праз 5 хвілін пасля ін'екцыі і доўжыцца 1,5—2 гадзіны, што цалкам дастаткова для выканання работы.

Не варта забываць, што, як і любая працэдура, звязаная з уздзеяннем на арганізм і, у прыватнасці, на скуру, перманентны макіяж мае свае супрацьпаказанні. Да іх адносяцца ўсе сістэмныя захворванні — у стадыі абвастрэння — са скурнымі праявамі. Калі ў зоне меркаванай работы ў вас ёсць якія-небудзь змяненні скуры, неабходна пракансультавацца з дэрматолагам. Працэдуру можна праводзіць толькі пасля адпаведнага лячэння і дазволу ўрача.

Праявы герпесу на вуснах у латэнтнай (скрытай) форме супрацьпаказаннем не з'яўляюцца. Але, калі ў вас схільнасць да гэтага захворвання, то для таго, каб вірус не актывізаваўся пасля працэдуры (а яна з'яўляецца 100-працэнтнай правакацыяй), рэкамендуецца правесці курс прафілактычнага лячэння супрацьвірусны мі прэпаратамі (пачынаючы прымаць за 7 дзён да працэдуры) — як унутр, так і вонкава. Для павышэння супраціўляльнасці арганізма можна з дазволу вашага ўрача дадаць прыём вітаміну С.

Не рэкамендуецца рабіць перманентны макіяж падчас цяжарнасці, а таксама пры цукровым дыябеце, бранхіяльнай астме, дрэннай згусальнасці крыві і схільнасці да ўтварэння келоідных рубцоў, абвастрэнні вугрыстага сыпу. Лепш устрымацца ад працэдуры ў перыяд «крытычных» дзён, пасля прыёму алкаголю і прэпаратаў, што павялічваюць час згусальнасці крыві.

Да супрацьпаказанняў адносяцца і розныя формы кан'юнктывіту — гэта датычыцца падводкі вачэй.

Адразу пасля заканчэння выканання перманентнага макіяжу невялікае пачырваненне і ацёк скуры з'яўляюцца натуральнай рэакцыяй на траўму. Для хутчэйшай ліквідацыі гэтых сімптомаў і аднаўлення скуры ўжо ў кабінеце выкарыстоўваюць раназагойвальную супрацьзапаленчую мазь або спецыяльны крэм.

Утварэнне скурачкі — гэта непазбежная рэакцыя арганізма. Пры правільна праведзенай працэдуры яна вельмі тонкая, нярэдка нагадвае проста лушчэнне і загойваецца даволі хутка, на працягу 5—7 дзён.

Магчымыя абмежаванні пасля працэдуры на час аднаўлення скуры — гэта адмова ад наведвання лазні, басейна, саўны. Таксама варта ўстрымацца ад уздзеяння прамых сонечных праменяў. І, вядома ж, ні ў якім разе не спрабаваць выдаляць скурачкі рукамі, бо ў гэтым выпадку можа ўтварыцца дэпігментаваны ўчастак.

Выключаецца прымяненне для лячэння перакісу вадароду, мазяў, што змяшчаюць антыбіётыкі, і спіртазмяшчальных саставаў — гэта можа прывесці да змянення колеру або абясколервання пігменту.

Выкарыстанне дэкаратыўнай касметыкі дапускаецца, як і звычайны касметычны догляд, акрамя прымянення саставаў з агрэсіўнымі кампанентамі (напрыклад, альфа-гідраксікіслотамі).

Поўнае загойванне наступае на 12—14-я суткі, калі скурнае покрыва аднаўляецца, а перманентны макіяж набывае свой канчатковы колер. Пасля гэтага, пры неабходнасці, магчымыя паўторная кансультацыя і правядзенне дадатковай карэкцыі.

Выкананы якасна перманентны макіяж — гэта цудоўная магчымасць змяніць знешнасць, стварыць яркі, прыцягальны твар. Набыць прыгажосць, якую не трэба падпраўляць некалькі разоў на дзень, якая не змыецца ў басейне, не «з'есца» ў рэстаране, не «паплыве» ад дажджу... Наогул, гэта рэдкая магчымасць быць у поўным узбраенні ў любой сітуацыі.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Інфарм-укол

# ПАХУДЗЕННЕ З РОЗУМАМ

**СМІ паведамляюць, што ў хуткім часе мадэлі-худышкі застануцца без работы. Маркетолагі заўважылі, што адзенне, якое дэманструюць не хваравіта хударлявыя дзяўчаты, разыходзіцца куды хутчэй.**

Тым не менш шэраг людзей занепакоены сваімі формамі. Прычым часам не без падстаў. У многім «фігурнаму неўрозу» паспрыялі ўсё тыя ж СМІ з іх ідэалізацыяй жаночай фігуры. Насамрэч жа для шэрагу людзей, у тым ліку мужчын, фігура не з'яўляецца галоўнай прыкметай прывабнасці. Вызначыць ідэальную вагу чалавека не проста, паколькі трэба ўлічваць целасклад.

Пубертальны ўзрост у дзяўчатак пачынаецца ў 11 і заканчваецца ў 18 гадоў. У гэты час у арганізме адбываюцца вельмі значныя змены, і вага павялічваецца нават больш, чым рост. Формы цела набываюць акруглы характар — плечы дзяўчыны становяцца больш вузкімі, бёдры акруглымі, малочная залоза павялічваецца, а ў брушной поласці пачынаюць выспяваць жаночыя палавыя клеткі. У пагоні за ідэальнымі формамі дзяўчаткі злоўжываюць дыетамі, што прыводзіць да парушэння абменных працэсаў, узнікнення захворванняў. Незбалансаванае харчаванне прыводзіць да парушэння менструальнай функцыі. Акрамя таго, дзяўчаткі забываюцца, што страчаную вагу можна вельмі хутка набраць. Так што худзець у час палавога выспявання нельга. Тым не менш можна заняцца спортам, плаваннем. Варта абмежаваць у рацыёне лішак вугляводаў і тлушчаў. А вось ежа, багатая на клятчатку, дае адчуванне сытасці і пры гэтым не дадае лішняй вагі.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 34 (80)

# ПАХ ПЫЛУ СТАГОДДЗЯЎ

*— З іх пастаянна пылінкі здзімаць трэба, — гаворыць загадчыца аддзела рэдкай кнігі Гомельскай абласной бібліятэкі Дзіна Мельнічэнка аб экспанатах, прывезеных з Веткаўскага музея народнай творчасці. І гэты выраз у нашым выпадку — самы што ні ёсць літаральны. Кнігі старыя, пыл стагоддзяў на старонках можна нават адчуць. Справа ў тым, што тут рэалізуецца сумесны бібліятэчна-музейны праект «Гісторыя беларускай кніжнасці». Каштоўнасці, якія зараз можна пабачыць за закрытымі вітрынамі, калісьці былі настольнымі кнігамі старавераў. А самі яны пасля ганенняў XVII стагоддзя аселі асобнай вялізнай суполкай у тым ліку непадалёк ад Гомеля — у Ветцы, зараз знакамітай сваім Музеем народнай творчасці.*

З яго і трапілі ў бібліятэчную экспазіцыю старажытныя кнігі. «Альфа і Амега» — па годзе выдання найбольш ранняя. Яна датуецца 1738-м і ўключае біблейскія тэксты ад стварэння свету да яго фіналу, таму і назва такая — сёння яе больш можна перакласці як «Пачатак і фінал». «Вучыцельнае Евангелле» (1790) — у ім тлумачацца тэксты самай галоўнай кнігі хрысціян — таксама ўваходзіць у склад экспазіцыі. Яно вылучаецца разнастайнасцю заставак і канцовак. «Часоўнік» выдадзены ў 1791 годзе. Пераплёт яго зроблены з дошак, пацягнутых скурай з блінтавым мудрагелістым цісненнем і сцягнуты металічнымі засцежкамі. Побач таксама «Часаслоў», выдадзены ў 1772 годзе. Гэтая кніга змяшчае ўладальніцкі запіс. Ён сведчыць аб тым, што «1956 года месяца октября по старому стилю 29 дня я Романов Александр Калинович устащик я купил книгу у Терентия Абрамовича Силина сию книгу Часослов на вечное владение. Христос Воскресе!»

Усе гэтыя кнігі аб'ядноўвала месца, дзе ў XVIII стагоддзі яны былі надрукаваныя. Таму і выставу назвалі — «З друкарні Супрасля». Мястэчка гэтае — Супрасль — зараз можна знайсці на карце іншай краіны, Польшчы, каля Беластока, а вось у XVIII стагоддзі нас аб'ядноўвала Рэч Паспалітая. Друкарня Супрасльскага Дабравешчанскага ўніяцкага манастыра лічылася буйным выдавецкім цэнтрам. Яна мела добрае абсталяванне, выкарыстоўвала разнастайныя шрыфты, мастацкія ўпрыгажэнні, наборны арнамент, гравюры на медзі. Звыш ста гадоў працавала друкарня: пачынаючы з 1690-х і да 1803 года. За гэты час усяго было выдадзена 420 выданняў. Як бы сёння сказалі, установа была з добрай рэпутацыяй на ўсёй Еўропе, таму выдаваліся там кнігі не толькі рэлігійнага зместу, але творы мастацкія і навуковыя. Пад уплывам ідэй Асветніцтва павялічыўся выхад перакладной навуковай і мастацкай літаратуры, арыгінальных твораў мясцовых аўтараў. На польскай мове былі выдадзены «Кароткі збор польскай гісторыі і геаграфіі», «Трактат пра пчол», «Асновы земляробства», «Прыгоды Гулівера» Джанатана Свіфта. У гэтай друкарні выпускаліся кнігі на лацінскай, старабеларускай, літоўскай, польскай, царкоўнаславянскай мовах.

Вось і стараверы, якія заўсёды вельмі строга ставіліся да захавання сваіх традыцый, размяшчалі ва ўніяцкім (на той момант) манастыры замовы на выданне сваіх кніг. Гэта было выгадна абодвум бакам. Адукаваныя паслядоўнікі старажытнага праваслаўя вельмі добра плацілі за выданне сваіх кніг. Акрамя таго, яны бралі на сябе клопаты па распаўсюджванні гэтай літаратуры. Вядома, што ў 1790-я гады ў Супрасльскай друкарні было выдадзена больш 50 стараверскіх кніг. Сярод іх — і ўласна стараверскія сачыненні, якія, як правіла, не выдаваліся ў іншых выдавецкіх цэнтрах.



Важнай асаблівасцю супрасльскіх стараверскіх кніг было і тое, што ў іх побач са спецыяльнай арнаментыкай можна знайсці і арнаменты, якія прымяняліся супрасльскімі друкарамі пры выданні кніг уніяцкіх і свецкіх, на польскай і лацінскай мовах. Цікава, што нельга даведацца, якімі тыражамі выдаваліся тады кнігі. Не было ў XVIII стагоддзі правілаў аб абавязковым паказанні такіх звестак на самім выданні.

Сёння ў музей рэдкай кнігі, заплаціўшы тысячу рублёў, можа зайсці кожны наведвальнік Гомельскай абласной бібліятэкі. Цікава, што за гэтыя сімвалічныя грошы супрацоўнікі праводзяць для кожнага персанальную экскурсію — ці то на 10 хвілін, ці то ад адкрыцця да закрыцця ўстановы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.**

## Фота слова

Яўгена Пясецкага



*У маёй хаце Дзяды,*
*зноў над свечкай*
*плывуць успаміны*
*І адлётнымі птушкамі*
*чэзнуць ў начной цішыні,*
*А гадзіннік нястомны*
*бяссонныя лічыць хвіліны,*
*Адразае нажніцамі стрэлак*
*мінулыя дні...*
*Дагарыць мой агеньчык,*
*цені лягуць на белым абрусе,*
*Але гэткія ж свечкі*
*унукі запаляць ізноў:*
*Не таму ў маёй хаце Дзяды,*
*што жыву ў Беларусі,*
*А таму беларусам завуся,*
*што маю Дзядоў.*

## Занатоўкі мастака



### ПІРАНДЭЛА І ПАЭТЫЧНЫ СЕМІНАР

Як жа даўно я не ездзіў на літаратурныя семінары! Запрашаюць і запрашаюць, а я ўсё знаходжу розныя нагоды і адмаўляюся. Гэта з-за таго, што ў маладосці наездзіўся на іх, набадзяўся на шмат гадоў наперад. Я назнаёміўся з рознымі паэтамі і празаікамі, з драматургамі і перакладчыкамі, з кнігавыдаўцамі і кнігапрадаўцамі. Стаміўся ад знаёмстваў, стаміўся падтрымліваць калялітаратурныя сувязі. Нават удзячнасці я стаміўся выказваць. А цяпер прыняў запрашэнне і прыехаў у Вільню на міжнародны форум па хайку. І не дзеля сябе я паехаў, а дзеля ўсіх сваіх сяброў, з якімі была створана школа беларускага хайкускладання. У Вільню прыехаў я з братам, Мірославам. Пасля тлумнага, перапоўненага новымі тварамі дня ён выпіў брэндзі і лёг спаць, а я пачаў чытаць навелу Пірандэла «Свіння»... «Свіння выцягнулася, зморшчыла ад задавальнення свой лычык, нібыта яна жадала ўсміхнуцца ад звычнай гаспадарскай пяшчоты, і падставіла шыю. Тады Сару вольнай рукою ўсадзіў у яе нож, у самае сэрца...» Як добра паміраць свінні, якая прынясе шмат радасці сваёй смерцю! Падумалася мне перад сном. А яшчэ мне падумалася, што наш Міхась Стральцоў, пэўна ж, чытаў навелу Пірандэла перад тым, як напісаць сваё геніяльнае апавяданне «Смаленне вепрука».

### БАН'Я І ГАЛЬШТУК

Што мяне ўразіла ад сустрэчы са старшынёю сусветнай асацыяцыі хайку (WORLD HAIKU ASSOCIATION) — спадаром Бан'я? Ружовы гальштук! Такога шаўкавіста-ружовага гальштука ў мяне няма. Я наогул ніколі не бачыў, каб мужчыны насілі гальштукі такога жаноча-ружовага колеру.

### РАДРЫГЕС І ВІНО

За вячэраю за мой стол падсеў паэт з Партугаліі — Давід Радрыгес. На вячэру ён крыху спазніўся. Партугалец замовіў сабе шклянку чырвонага віна. Пакуль афіцыянтка хадзіла па віно, Давід паспеў расказаць пра сваю маці. Ёй дзевяноста шэсць (!) гадоў, і кожны вечар яна выпівае шклянку чырвонага. Афіцыянтка вярнулася і сказала, што чырвонае віно скончылася, але яна яшчэ зможа прынесці белага. Каб такое здарылася ў Беларусі, мы б сказалі, што такое можа здарыцца толькі ў Беларусі. Але, дзякуй Богу, здарэнне з чырвоным віном адбылося не ў Беларусі. Давід ні на кроплю не засмуціўся. Ён пахваліў белае віно і распавёў, што ягоны тата працаваў дэгустатарам партвейнаў.

### АСАКА І РУЖЖО

Японец Шынтаро Асака сказаў партугальцу Давіду Радрыгесу, што партугальцы цалкам змянілі культуру Японіі, бо прывезлі на японскія выспы ружжо. На гэта партугалец адказаў тым, што моцна спачувае тагачасным і сёняшнім самураям.

### ТАЎШНЕР І СВЯТЛО

Прыемна, калі ўбачыш чалавека, які ў начным горадзе стаіць на пустым скрыжаванні і чакае зялёнае святло. Ён чакае дазвол на пераход вуліцы, як яго чакаюць беларусы. Але ён не беларус, а ён аўстрыец Дэтмар Таўшнер. Ён, як і ты, піша хайку і пераходзіць вуліцы на зялёнае святло, што прыемна.

### БРЭДЗІС-МАКАВЕЙ І АЎТОГРАФЫ

Малады латышскі аматар японскага вершаскладання — Адрыян Брэдзіс-Макавей пачаў збіраць аўтографы ў новенькую анталогію хайку. «Як зборы?» — пацікавіўся я ў яго праз пару гадзінаў. «Японцы цяжка паддаюцца ідэнтыфікацыі!»

### СУЧЫ І СТОМА

Прафесар такійскага ўніверсітэта падышоў да мяне і спытаў, каго з японскіх паэтаў я люблю. На пытанне прафесара Сучы я адказаў, як вучань настаўніку, пералічыў чатырох вялікіх: Басё, Бусона, Ісу і Сікі, а потым дадаў пятага — п'яніцу Сантока. Прафесар дастаў з кішэні капэрту з фотаздымкамі і падарыў мне «Дамок Ісы ў парку». А яшчэ ён паскардзіўся на тое, што ў WORLD HAIKU ASSOCIATION адказвае за пераклады вершаў з нашага рэгіёну, і яму вельмі цяжка, і ён стамляецца. Я паспачуваў Сучы. І яшчэ... Цяжка паверыць, але любімы паэт у прафесара Сучы — наш зямляк Адам Міцкевіч.

### КУДРА І СЯБАР

Іду ў рэстарацыю на ланч, а з рэстарацыі выходзіць расійскі хайдзін Кудра. «Пятровіч, вы так хутка паелі?» — пытаю Зміцера Кудру, які падпісвае свае хайку псеўданімам Petrovich. «Не, я бягу нашых паклікаць...» Праз пяць хвілін Кудра з'явіўся ў рэстарацыі. Ён быў адзін. Пад пахаю ў Пятровіча паблісквала пляшка гарэлкі. «Бачу, вы добрага сябра паклікалі!» — кажу Пятровічу. А ён мне ў адказ праспяваў кароткі расійскі неперакладальны верш: «Можем вместе бутылочку приголубить».

### ЛІДЗІЯ І АНДРЭЙКА

Паэтка з Аўстраліі — Лідзія — спытала ў мяне: «Ці ўсе беларускія паэты моцна храпуць?» Каб не кінуць калегу-суайчынніка ў бядзе-адзіноце, я запэўніў чужую аўстралійку, што храпуць — усе. Але літоўскі паэт не пагадзіўся з маім талерантным абагульненнем. Ён сказаў, што наш Андрэйка Хадановіч хроп неверагодна гучна, хроп ажно захлынаўся ўласным храпеннем. Аўстралійка ўсю ноч адпакутавала, хоць спала яна і не з Андрэйкам, а ляжала праз дзве сцяны ад яго. Каб пераканаць прысутных у праўдзівасці сваіх словаў, літоўскі паэт прадэманстраваў храпенне Андрэйкі. Размова адбывалася ў віленскім касцёле святой Кацярыны, дзе мы чыталі са сцэны свае вершы. Ахоўнік падышоў да літоўскага паэта, папрасіў яго выйсці на вуліцу і храпці там.

**Адам ГЛОБУС.**

## У бібліятэцы НАН адкрываецца выстава да 100-годдзя Максіма Лужаніна

У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі 2 лістапада адкрываецца выстава «Я свой радок на сэрцах важу...». Яна прысвечана 100-годдзю з дня нараджэння Максіма Лужаніна — вядомага айчыннага паэта, празаіка, публіцыста, кінадраматурга і перакладчыка.

Як паведаміла адзін з кураратараў праекта Таццяна Жук, экспанавацца будуць розныя матэрыялы з асабістага архіва пісьменніка, што захоўваюцца ў фондзе аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў бібліятэкі.

Асаблівае месца займаюць матэрыялы, што датычацца службовай і грамадскай дзейнасці Максіма Лужаніна. Гэтыя дакументы звязаны з яго працай на кінастудыі «Беларусьфільм», у якасці дэпутата Вярхоўнага Савета БССР, удзельніка XXIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Прадстаўлены таксама пісьмы Максіма Танка, Янкі Брыля, Аркадзя Куляшова, Уладзіміра Караткевіча і іншых пісьменнікаў.

**Канстанцін СТАЛЯРЧУК, «Мінск—Навіны».**

# Топ-10 ПАДАРУНКАЎ ДЛЯ АКТРЫСЫ

**ЗАСЛУЖАНАЯ артыстка Беларусі Зоя Белахвосцік адзначыла 50-годдзе. Вы ў гэта верыце?!. Аднак яна гатовая падзяліць сваё свята з гледачамі: 2 лістапада на галоўнай сцэне тэатра імя Янкі Купалы будзе іграць бенефіс. Для гэтага яна абрала спектакль «Крывавая Мэры», які ўжо некалькі гадоў не ідзе. Яго спецыяльна аднаўляюць дзеля бенефісу і сыграюць толькі адзін раз. Гэта падарунак актрысы для гледачоў, якія палюбілі гэты спектакль, у якім яна зусім не такая, як у іншых ролях. Якая яна насамрэч — дапамогуць зразумець падзеі, якія яна сама вызначыла падарункамі, якія ёй зрабіла жыццё.**



Фота Віктара ДУБОЙСКАГА.

### 1.

— Першы, галоўны і, магчыма, адзіны ў маім жыцці падарунак з неба — нараджэнне ў такой сям'і. Не адно пакаленне было звязана з тэатрам, — кажа Зоя Белахвосцік. — І бабуля з дзядулем (артыст Глеб Глебаў, легендарны артыст тэатра імя Янкі Купалы. — **Аўт.**), і мама з татам (акцёр Валянцін Белахвосцік усё жыццё працаваў у Купалаўскім. — **Аўт.**). Мой прыход у гэтую сям'ю і з'яўляецца самым вялікім падарункам. Дзядуля і бабуля на мяне вельмі моцна паўплывалі яшчэ ў самыя маленькія гады. У тэатр як у такі мяне не вадзілі — я там была ўвесь час. Яднанне з ім само сабою адбылося непрыкметна для мяне. Мой прыход у гэтую сям'ю і з'яўляецца самым вялікім падарункам. І, магчыма, адзіным. Таму што ўсе іншыя падарункі жыцця з'яўляліся дзякуючы маім уласным намаганням.

### 2.

— Я стала тым, кім хацела. Не проста так стала, а ўсё-такі скончыла тэатральна-мастацкі інстытут, хоць адразу туды не паступіла. Мая мара здзейснілася дзякуючы дапамозе, умяшанню звонку. Калі я не паступіла, то пайшла вучыцца ў Інстытут культуры, дзе ў мяне былі вельмі добрыя педагогі. Галіна Пятроўна Вешкарова мяне адкрыла для самой сябе і паказала прыроду прафесіі, я яе адчула. А потым, калі мы былі на трэцім курсе, на Дзень тэатра падрыхтавалі капуснік, яго прыйшоў паглядзець Барыс Пятровіч Эрын. Пасля нашага капусніка ён патэлефанаваў маім бацькам і спытаў: «А што яна робіць у Інстытуце культуры?» Ён не павінен быў увогуле нічога рабіць, яго ўвогуле гэта не павінна было датычыцца. Але ён заняўся, сабраў маіх бацькоў, сказаў, што я там прападу, што мне месца ў іншай ВНУ. Яны пранікліся гэтым, пастараліся неяк мяне перавесці — пагаварылі з Зінаідай Іванаўнай Браварскай, Эрын таксама пагаварыў з ёй.

Зінаіда Іванаўна Браварская магла нічога для мяне не рабіць, не браць мяне на курс. Гэта таксама падарунак, таму што я ведаю, наколькі гэта складана, як гэта можа не атрымацца. Але атрымалася. Я атрымала дыплом тэатральна-мастацкага інстытута ў выніку вялікіх намаганняў і вучобы, якая зацягнулася замест 4 гадоў на 6 (3 гады ў адным і 3 гады ў другім інстытуце).

### 3.

— Наступным падарункам лёсу (з пункту гледжання паслядоўнасці) я назаву прыход у тэатр імя Янкі Купалы. Я не думала, што туды патраплю. Пасля заканчэння інстытута ў нас было размеркаванне, і ў мяне былі вельмі добрыя прапановы. Напрыклад, Рускі тэатр у Рызе.

***— І што ж вы не пайшлі?***

— Па-першае, Купалаўскі тэатр нашмат лепшы, і я заўсёды марыла ў яго патрапіць. Гэта была мяжа маіх мараў. А потым я стала іграць Паўлінку. Я думала, што буду іграць Паўлінку і больш нічога. Спачатку быў падарунак, што мяне ўзялі на ролю Паўлінкі на 4-м курсе. А потым падарунак — што я ўсё-такі патрапіла ў гэты тэатр, а не проста прыходзіла яе іграць.

***— З Паўлінкі пачынаць вельмі ганарова?***

— Паўлінка для мяне — не столькі роля, колькі вырашэнне лёсу. Таму што я не ставілася да яе так проста. Калі цяпер людзі кажуць, што лепшай Паўлінкі, чым я, не было, то гэта сведчыць пра тое, што ў мяне там быў шырокі дыяпазон. Я не іграла яе, як Ала Пятроўна Долгая, як цяпер іграюць дзяўчаты. Мне б ніхто нічога не даў іграць потым, каб у той жа «Паўлінцы» я нічога не паказала. Гэта вельмі складаная роля, яна не плоская, хоць і простая на першы погляд. Але я ні да якой ролі не ставілася як да простай, таму я старалася зрабіць яе аб'ёмнай. Гэта было патрэбна мне перш за ўсё.

### 4.

— Я ў тэатры сапраўды знайшла свой лёс — мужа Сашу Гарцуева, які тады быў акцёрам. Падарунак у тым, што ў мяне з'явілася сям'я. Хоць і нельга сказаць, што ўсё склалася само сабою, і ў гэтым было ўсё складана і неадназначна.

***— Даводзілася змагацца за сваю сям'ю?***

— Я ў любым відзе барацьбы не баюся нічога. Мяне палохае, калі яе няма.

***— На чым, на вашу думку, трымаецца сям'я?***

— Толькі на каханні. Яго можна захаваць на жыццё — але гэта залежыць ад людзей. Дзеля гэтага трэба папрацаваць і бачыць у чалавеку перш за ўсё яго бясспрэчныя вартасці... Я думаю, што любая з'ява, як і любы чалавек, можа перастаць цікавіць. Усё залежыць ад людзей, якія хочуць падтрымліваць цікавасць.

***— Спектакль, які вы выбралі на бенефіс — таксама пра гэта. Спектакль, які рве душу. Сыграць гэта так, значыць гэта пражыць, адчуць, ці недзе бачыць, як гэта можа быць. Адкуль вы чэрпалі эмоцыі, з якіх потым пабудавалася роля Мэры?***

— Адтуль жа, адкуль і іншыя, — акцёрская фантазія, уяўленне і вялікая колькасць назіранняў. Назіранняў вакол сябе, блізкіх, іншых людзей. Гэта прафесійныя рэчы, як кажуць акцёры.

### 5.

— Тое, без чаго сям'я не можа быць, — у мяне атрымалася нарадзіць Валю. Гэта таксама вельмі важна, таму што магло не здарыцца... Ну, быў бы ў мяне тэатр, ролі. Але б не было дзіцяці. Пасля майго ўласнага нараджэння Валя — самы галоўны і цудоўны падарунак у маім жыцці.

***— Калі чаканае дзіця з'яўляецца, то даводзіцца рабіць выбар: ці застацца ў прафесіі і прысвяціць сябе гэтаму дзіцяці, ці неяк сумяшчаць. У вас выбар такі быў?***

— Я зрабіла выбар, калі трэба было яе вынасіць. Калі яе выношвала, то не працавала ў тэатры фактычна. Заробак атрымлівала, проста выходзіла там, дзе можна было пастаяць, пасядзець, але ў акцёрскім плане практычна нічога не рабіла. Час, калі я яе чакала, у асноўным правяла ў бальніцы — лежачы. Гэта быў мой выбар. А потым, калі я нарадзіла, мне ўсе дапамагалі і я вельмі хутка выйшла на працу — праз месяц. Немаўля фактычна жыло ў тэатры. Мы з дачушкай хадзілі на рэпетыцыі. Пакуль мы рэпеціруем, яна ў нас ляжыць ціхенька ў крэсліцы ў грымёрцы. Усё было цудоўна, ніякіх праблем не было, хоць усе насіліся як шалёныя... Артысткі ніколі не сядзяць з дзецьмі гадамі. Інакш вельмі вялікая праблема ўзнікае. Не, калі артыстка нікому не патрэбная, то яна можа і не вяртацца ў тэатр. А калі яна патрэбная, і калі атрымліваецца сумясціць не ў шкоду нікому, то так і будзе. У нас з Валяй усё было ладна, я з ёй не расставалася нават у тэатры.

***— Напэўна, таму і атрымалася тэатральнае дзіця.***

— Так, нават у большай ступені, чым я. Тое, што яна стала артысткай — таксама вялікі падарунак. Бо не можаш чакаць, што гэта адбудзецца, не ўяўляеш, якія ў дзіцяці магчымасці, а потым усё само неяк выбухне — раз!.. Мы былі не супраць, але мы не чакалі, што яна будзе такая, як атрымалася.

### 6.

— Тое, што ў нас у тэатры з'явіўся Коля Пінігін. Калі адкрывалася малая сцэна 20 гадоў таму — якраз яго прыход. Гэта быў падарунак не толькі для мяне. Ён стаў задзейнічаць у спектаклях шмат каго — і мяне, і Лену Сідараву, Віцю Манаева, Лену Іваннікаву, Сашу Лабуша. Усе зазвінелі. Нейкая аддушына, новае акенца адчынілася. Мы ўсе ўздыхнулі, нам стала вельмі цікава, весела. Цікава было ў працэсе саміх рэпетыцый. Адкрывалася «Малая сцэна» «Жанчынай з мора», было «Жыццё Карыцына» Паповай і пазней «Ідылія»... Спектаклі разам з Пінігіным — былі добрай вучобай, цудоўнымі падарункамі.

### 7.

— У 37 гадоў я атрымала званне заслужанай артысткі Беларусі. Хоць я да гэтага стаўлюся неадназначна, таму што званні нам даюць людзі, прычэпліваюць нейкія бірачкі. Але ўсё-такі мне яго далі: я яго не прасіла і не ўяўляла, што мне яго дадуць. Я вельмі шчыра парадавалася гэтаму. Я не за званне працавала. І мне было вельмі прыемна, таму што насамрэч артыстам патрэбна гэтая адзнака. У іх акрамя такіх адзнак асаблівых стымулаў няма. Яшчэ добрае слова.

### 8.

— Нехта нешта прыемнае скажа, ці павітаецца. Ці ліст напіша нейкі глядач. Тэатральны глядач — асаблівы. Ён вельмі стрыманы. Сапраўдныя тэатральныя прыхільнікі — людзі сціплыя, інтэлігентныя як правіла. У мяне ёсць некалькі лістоў разумных, тонкіх. Сустракаліся людзі ў маім жыцці вельмі прыемныя. Напрыклад, еду я ў метро. Зачуханая, стомленая, пасля заняткаў у Акадэміі мастацтваў. Раптам падбягае нейкая дзяўчына, вітаецца і кажа: «Вазьміце, я хачу вам падарыць кветкі». Дорыць і просіць яшчэ аўтограф. Я хуценька пішу ёй аўтограф у нейкім сшытку. І яна, чырванеючы, сыходзіць на наступным прыпынку. Такія імпульсіўныя моманты бываюць вельмі цёплыя. Калі ты разумееш, што нешта такое зрабіў добрае, за што атрымаў кветкі. Хутчэй за ўсё, гэта былі кветкі, якія ёй падарыў малады чалавек — яна не падпільноўвала мяне ў метро спецыяльна. А яна аддала мне тое, што было на той момант дарагое для яе. Такія моманты значаць для артыстаў больш, пасля іх хочацца жыць.

***— Кампліментамі вас асыпалі?***

— Я так гэтага не люблю і заўсёды стараюся пазбягаць. Нельга прыхільнікаў дапускаць вельмі блізка, адкрываць душу, лепш трымацца на адлегласці, інакш могуць быць жудасныя наступствы.

***— Былі выпадкі, калі вас пераследавалі?***

— Так. Адна жанчына хацела мне сказаць, якая я вялікая, хацела мяне правесці да аўтобуса, прарывалася ў нумар, дарыла падарункі, дзіўным чынам сябе паводзіла. Была цэлая асада. Нашы артысты казалі ёй, што я сышла. Яна выходзіла з гатэля — я перабягала ў іншы нумар. Было гэта на гастролях ва Уфе. Хоць у нас таксама бываюць надзвычай апантаныя прыхільніцы, але яны ў асноўным мужчын пераследуюць. І калі ў мужчын, якіх яны выбіраюць, ёсць жонкі, то на іх можа абрынуцца нечаканая нянавісць, якая выражаецца ў непрыемных размовах, лістах. Я таксама «папалася» — ужо ў якасці жонкі. Такіх прыхільніц аднойчы выклікаў і прыструніў дырэктар тэатра — яшчэ Вашкевіч быў. А потым ізноў разышліся — падарункі ўсялякія сталі дарыць тым, каго выберуць, Фёдаравічу ў тым ліку, лісты пайшлі пра тое, чаго ён заслугоўвае і дасягнуў бы, калі б не жонка. І розныя эпітэты пра мяне. Але такога мала, у нас гледачы сціплыя.

### 9.

***— Цяпер ёсць магчымасць сябе праявіць у кіно. Лічыцца, што кіно можа моцна паўплываць на лёс акцёра.***

— Да мяне такое кіно не прыходзіла. Наўрад ці прыйдзе. Таму што я хацела б нешта адно зрабіць у кіно для сябе і яшчэ нейкіх людзей, але я не бачу для гэтага магчымасці. Але радасна, што ў мяне быў фільм з маладым рэжысёрам Сашам Канановічам «Грашовае дрэва». Роля ў мяне абсалютна невялікая, я іграю маму Васі, галоўнага героя. Гэта быў асаблівы падарунак. Па-першае, таму што гэта беларускае кіно. Па-другое: там былі ўсе беларускія артысты, прычым яны ўсе абсалютна геніяльныя. Я ўяўляю, якое кіно з нашымі артыстамі можна зняць, калі выдатны рэжысёр і годны сцэнарый — такія тыпажы, такія таленты! Адна толькі Тамара Міронава чаго вартая — Чарлі Чаплін у спадніцы. Якая цудоўная моладзь! Мне здаецца, такога кіно, як атрымалася, яшчэ ніхто не здымаў. Тое, што я бачыла, — смешна і дзіўна. Магчыма, таму што я «ў матэрыяле». Але гэта цікава па манеры, аператарскай працы, працы мастака.

### 10.

— У мяне ёсць сабака Груша — гэта падарунак рэжысёра Каці Агароднікавай. Магчыма, не пафасны падарунак, у сістэме тых, якія былі названыя. Але яна прыгожая, шляхцяначка. Спачатку Грушай займалася я. Яна ў нас невялікая, але вельмі моцная. І цяпер, калі я вяду яе выгульваць, то атрымліваецца наадварот — яна мяне выгульвае. Я цяпер гуляю меней, але і Саша, і Валя з задавальненнем гуляюць з Грушай. Я больш гатую ёй ежу. Усе разам ёю займаемся. Гэта ўвогуле дысцыплінуе. Але Груша насамрэч спрашчае наша жыццё. Таму што вяртае да сапраўдных пачуццяў. Калі нешта адбываецца, калі я жудасна стамілася, у дрэнным настроі прыходжу дадому, то ўсё адыходзіць, ледзь бачу гэтую мордачку. Для яе мы ёсць утраіх. Ёй усё адно — хто мы, якія, колькі грошай зарабляем, прыгожыя ці не. Яна не ўмее хлусіць. І сваёй прыроднай пяшчотай нас лекуе. Чамусьці заўсёды ведае, калі нешта здарылася непрыемнае, што трэба падысці, прыціскаецца галавой, за шыю абдымае лапамі, адчуваеш, што зараз гэта патрэбна менавіта мне. Яна мяне любіць не за тое, што я заслужаная артыстка, не за тое, што даю ёй паесці, а за тое, што я проста ёсць.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ПЕРАСТУПІЦЬ МЯЖУ

**Два месяцы таму «Звязда» падала ідэю ўсталявання помніка ў гонар 600-годдзя Грунвальдскай бітвы. Вялікая падзея ў гісторыі Беларусі, юбілейная дата, то чаму б дастойна і не адзначыць яе?**

На працягу гэтых месяцаў я сустракаўся з кіраўнікамі некаторых раёнаў і перад кожным узнімаў пытанне наконт устаноўкі помніка. Паказваў «Звязду», рабіў націск на гераізм нашых продкаў, імкнуўся зацікавіць праектам... і ўсе старшыні райвыканкамаў выступалі за ідэю ўсталявання помніка ў сваім райцэнтры. А адзін кіраўнік настолькі загарэўся ідэяй і вітаў яе, што падумалася: «Вось ёсць жа ў нас такія патрыёты!». Нават уявіў, як над адным з пагоркаў гэтага старадаўняга беларускага горада зазіхацяць у імклівым палёце крылы Перамогі.



Помнік.

Праз некалькі дзён патэлефанаваў у райвыканкам, і намеснік старшыні стрымана паведаміў, што на наступным тыдні будзе рашэнне — ставіць помнік ці не. Тут і з'явілася падазрэнне, што ў кіраўніцтва запал прапаў і, напэўна, давядзецца праштурхоўваць ідэю ў іншых кабінетах.

Так і атрымалася. Праз нейкі тыдзень патэлефанавалі з райцэнтра і паведамілі: «У праекце «Звязды» мы ўдзельнічаць не будзем!»

Калі не, то ніхто і ўпрошваць не стане, але не за лепшае было б яшчэ пры размове вытрымаць паўзу. Маўляў, справа сур'ёзная, неабходна ўсё ўзважыць, абдумаць...

— Будзем ставіць і асвяцім яшчэ. Я пагавару з дабрачынным, — паабяцаў кіраўнік другога раёна. А калі я завітаў да яго праз нейкі час, то пачуў:

— А можа, нам паставіць помнік Аляксандру Неўскаму — ён таксама крыжакоў разбіў?

Магчыма, гэта жарт быў? Хоць ён не такі бяскрыўдны, як можа падацца на першы погляд. Словы з іншай песні.

Калі Грунвальд працуе на Беларусь, яе суверэнітэт, то А. Неўскі гэты суверэнітэт размывае. Ды і памяць святога князя ўвекавечана ў шматлікіх храмах, якія носяць яго імя. У Баранавічах колькі гадоў таму ўзвялі новы, а яшчэ адзін на раёне — у Сталовічах. Ды колькі іх па Беларусі.

Чаму не ўзвесці храм «Памяці палеглых пад Грунвальдам»? Такая думка нікому і ў галаву не прыйшла. А чаму нельга адбудаваць і такі храм?

Думаю, найперш неабходна сканцэнтраваць увагу на тых момантах нашай гісторыі, якія абуджаюць нацыянальную свядомасць беларусаў.

Цікавай была размова з галоўным архітэктарам аднаго з раёнаў. Чалавек адразу ж загарэўся ідэяй, паабяцаў знайсці месца для помніка, зрабіць прывязку да мясцовасці і нават пераканаць старшыню райвыканкама ў неабходнасці такога манумента. Але, як толькі пачуў, што творчы працэс будзе на грамадскіх пачатках, а гэта значыць без грошай, то адразу абмяк, нібы той мячык, з якога спусцілі паветра.

Безумоўна, што без грошай тут не абысціся, бо неабходна будзе набыць матэрыялы ды заплаціць рабочым, якія падключацца да работы на заключным этапе. Але фінансавыя затраты будуць мізэрнымі. Напрыклад, пляцоўка наўкол помніка і падыходы да яго трэба выкласці з камення, а не з тратуарнай пліткі. Брук найлепш адпавядаў бы мінуўшчыне, а каменне па палях маглі б назбіраць хлопцы і дзяўчаты з БРСМ — рэальны ўнёсак у агульную справу.

Для ўсталявання помніка неабходна рашэнне мясцовай улады, і яго маглі б прыняць дэпутаты райсавета, але зноў жа:

— А што скажуць людзі? — спытаў у мяне знаёмы старшыня аднаго райсавета.

Многія пра Грунвальд не чулі, але ж раённая газета магла б і растлумачыць людзям, вярнуць ім памяць, бо не іх віна ў тым бяспамяцтве, якое насаджалі народу стагоддзямі. І калі гістарычную памяць вяртаць, як не сёння! Чаго для гэтага не хапае?

А кіраўнікоў можна зразумець. Вядома ж, прычына не ў народзе, а ў тым, што ў нашага чыноўніка няма ўнутранай неабходнасці ў тым помніку. Вось калі зверху будзе ўказанне, то адразу ж успомняць гісторыю, Грунвальдскую бітву і да яе юбілею падрыхтуюцца. А так навошта ўвесь гэты клопат? А раптам за ініцыятыву і «шыю намыляць». Вось у гэтым, найперш, і праблема.

«Звязда» імкнецца прыцягнуць увагу да 600-годдзя Перамогі пад Грунвальдам, але газета не навязвае праект помніка. Пакуль што выбару няма. Калі б былі абнародаваны 3-4 праекты, то склалася б іншая сітуацыя. Магла б узнікнуць шырокая дыскусія, а гэта толькі спрыяла б справе папулярызацыі гадавіны далёкай Перамогі.

Былі б пад помнік закладзены вялікія грошы, то нашы творцы заварушыліся б, але ў конкурсе (калі б ён быў) перамаглі б не самыя таленавітыя, а, хутчэй за ўсё, «дужыя».

Давялося шукаць падтрымкі ў некалькіх райвыканкамах Гродзенскай і Брэсцкай абласцей, а чым усё закончылася — чытачу вядома. Праўда, чакаю яшчэ аднаго адказу, але і ён, відавочна, будзе адмоўным.

Але ж надзея... Ды і хочацца верыць, што зробленае застаецца.

Каля касцёла ў Крошыне стаіць валун, на якім гадоў 25 таму я выбіў на лацінскай і беларускай мовах: «Жыццё кароткае — Радзіма вечная». Кожнае слова, як цвік забіты ў труну — раз і назаўсёды. У мінулым ведалі цану такім выслоўям. І сёння, бачачы гэты валун, я атрымліваю задавальненне, хоць усталёўваўся той камень на голым энтузіязме. Стаіць памятны знак і ў Сталовічах — на месцы бітвы вялікага гетмана Літоўскага М. Агінскага з войскам А. Суворава. Але калі б тагачасныя кіраўнікі калгасаў — у першым выпадку Георгій Казляк, а ў другім — Валерый Раінчык не падтрымалі і не далі тэхніку, каб прывезці тыя валуны, то нічога не атрымалася б.

Вось гэтаксама і з помнікам у гонар 600-годдзя Грунвальдскай бітвы. Будзе падтрымка ўлады, то і праблемы, звязаныя з усталяваннем манумента, знікнуць.

І калі на тым помніку можна будзе прачытаць: «Нашым продкам, палеглым у бітве пад Грунвальдам 15 ліпеня 1410 года. Удзячныя нашчадкі», то напэўна ж, у душы многіх нешта варухнецца.

Звыклыя словы, але яны будуць сведчыць, што мы здолелі пераступіць мяжу, якая доўгі час блакіравала нашу свядомасць.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.**



Памятны знак.



На алеі да магілы.

# «ЗВЯЗДАРЫНАЧКА»

**Працягваецца штотыднёвая віктарына, адказы на пытанні якой, нагадаем, вы можаце дасылаць у рэдакцыю двума шляхамі: традыцыйна, праз пошту з пазнакай «Звяздарыначка» па адрасе рэдакцыі (220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а) і на рэдакцыйную электронную скрыню (info@zvyazda.minsk.by). Удзельнічайце і перамагайце! Хочацца верыць, што вы ўпадабаеце гэтую новую інтэрактыўную інтэлект-рубрыку!**

**Вядучы рубрыкі Мікола ТАМАШЭВІЧ.**

## ШОСТЫ ТУР ВІКТАРЫНЫ

**1.** Як звалася першае перыядычнае выданне на беларускіх землях, што выдавалася на польскай мове і калі яно пабачыла свет?

**2.** У які сярэднявечны замак у адну са сцэнаў умураваная галава барана і навошта яна там?

**3.** Дзе, падчас Французска-расійскай вайны 1812 года, Напалеон прыняў канчатковае рашэнне наступлення ў глыб Расійскай імперыі?

**4.** Беларуская пісьменніца XVIII стагоддзя, гаспадыня радзівілаўскай рэзідэнцыі ў Нясвіжы, таленавітая паэтка і драматург. Хто гэта?

**5.** Якой беларускай дзяржаве належыць наступны гімн (ягоны пачатак)?

«Мы беларусы, з братняю Руссю
Разам шукалі к шчасцю дарог.
Ў бітвах за волю, ў бітвах за долю
З ёй здабылі мы сцяг перамог!..»



**6.** Выдатны беларускі гісторык і пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, які вярнуў нашай краіне гістарычную праўду ў тэзе: «Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае». Хто гэта (здагадайцеся па здымку)?

**7.** Як завуць беларускага мастака, аўтара габелена стагоддзя, які быў уключаны ў Кнігу рэкордаў Гінэса?

**8.** Калі адкрыўся канал-цёзка беларускага кампазітара і грамадскага дзеяча? Пра што ідзе гаворка?

**9.** Што, паводле Канстытуцыі Беларускай ССР, складала сацыяльную аснову гэтай краіны? Што азначала трактоўка: «Узмацненне сацыяльнай аднароднасці грамадства»?

**10.** «Калі на небе з'яўляецца Мятла, гэта папярэджанне людзям аб вялікім няшчасці. Чараўнікі кажуць, што некалі прыйдзе такая страшэнная Мятла, што закрые ўсё неба, а потым ляжа на зямлю. Усе і ўсё загіне, і будзе канец свету». Што нашы продкі называлі Мятлою?



**11.** Гэты беларускі горад мае ажно два гербы за кошт таго, што ён двойчы атрымліваў Магдэбургскае права. Што гэта за замкавае мястэчка?

**12.** У XVI стагоддзі Беларусь пазнаёмілася з гэтым струнным музычным інструментам, дзякуючы каралеве Рэчы Паспалітай Боне Сфорцы, якая «завезла» з Італіі прафесійных музыкаў, а таксама шырока распаўсюджвала практыку стварэння музычных гуртоў. Што гэта за інструмент?




**13.** У выніку чаго былі назаўжды згубленыя непаўторныя краявіды «Палескай Амазоніі»?

### АДКАЗЫ НА ЧАЦВЁРТЫ ТУР ВІКТАРЫНЫ:

1. «Віленская літаратурная газета» («Gazeta literacka Wilenska»)
2. Нясвіж. Касцёл (Фарны) Найсвяцейшага Божага цела
3. Юр'еў (сучасны Тарту ў Эстоніі)
4. Адам Міцкевіч. Пра Беларусь
5. Табага
6. Уэйн Дуглас Грэцкі
7. Ілля (Галляш) Капіевіч
8. Чынш
9. Горы-горацкі земляробчы інстытут
10. Роўныя (аднолькавыя) між сабой
11. Сяргей Пракудзін-Горскі. Віцебск
12. ~3,5 мільёна чалавек
13. «Мінскае вытворчае аб'яднанне вылічальнай тэхнікі».

**P.S.** ***Ад гэтага тура, магчыма часова, але ж змяніўся лідар: ім стала наша чытачка з Асіповічаў Валянціна Чаропка, якая ўжо два туры запар паказвае стаадсоткавыя вынікі. У астатніх жа ўдзельнікаў найбольш пытанняў узнікла ў вызначэнні НХЛаўскай суперзоркі з беларускім паходжаннем. У дадатак некаторыя ўдзельнікі няправільна адказалі на апошняе пытанне, спакусіўшыся на газетную вутку аб тым, што «Інтэграл», нібыта, стварыў першы беларускі ноўтбук, але гэта абвяргае само кіраўніцтва прадпрыемства.***

# ДА КАНЦА ГОДА БЕЛАРУСЬ ЗАВЕРШЫЦЬ АЦЭНКУ ІНФРАСТРУКТУРЫ ПА 19 КІРУНКАХ, ВЫЗНАЧАНЫХ МАГАТЭ ДЛЯ БУДАЎНІЦТВА АЭС

**Пра гэта паведаміла журналістам начальнік аддзела міжнароднага супрацоўніцтва, падрыхтоўкі кадраў і інфармацыйнага забеспячэння Дэпартамента па ядзернай энергетыцы Лілія Дулінец. Беларусь на працягу многіх гадоў супрацоўнічае з Міжнародным агенцтвам па атамнай энергетыцы (МАГАТЭ) па розных кірунках, пасля прыняцця рашэння аб будаўніцтве АЭС у нашай краіне распачалося супрацоўніцтва ў галіне рэалізацыі ў нас ядзернай энергетычнай праграмы.**

Апроч семінараў і навучальных трэнінгаў, у рамках праграмы мяркуецца арганізаваць візіты нашых вучоных і выкладчыкаў у вучэбна-трэніровачныя цэнтры АЭС і навукова-даследчыя інстытуты замежжа, а таксама на дзейныя АЭС (плануецца, што гэта будуць станцыі Кітая, Карэі, Украіны, Расіі, Фінляндыі, Балгарыі) і атамныя станцыі, якія толькі будуюцца.

Прыкладная камп'ютарная навучальная сістэма будзе пастаўлена ў чатыры ВНУ Беларусі, якія адкрылі новыя спецыяльнасці для падрыхтоўкі кадраў для будучай АЭС. Акрамя таго, навучальная сістэма з'явіцца ў Аб'яднаным інстытуце энергетычных і ядзерных праблем «Сосны», дзе цяпер актыўна вядуцца работы па стварэнні лабараторыі для практычных заняткаў будучых работнікаў атамнай станцыі, у Дэпартаменце па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы МНС, у Дэпартаменце па ядзернай энергетыцы і ў Дырэкцыі будаўніцтва атамнай электрастанцыі.

Л. Дулінец адзначыла, што Беларусь будзе рыхтаваць не толькі спецыялістаў для непасрэднай работы на АЭС, але і спецыялістаў па праектаванні, па будаўніцтве, спецыялістаў для надзорных органаў, прафесарска-выкладчыцкі склад і г.д.

МАГАТЭ рэкамендуе ўсім дзяржавам, якія збіраюцца ўзвесці ў сябе першую атамную станцыю, спачатку правесці ацэнку гатоўнасці сваёй інфраструктуры па 19 пазіцыях. Сюды ўваходзіць ядзерная бяспека, фінансаванне, радыяцыйная абарона, падрыхтоўка кадраў і г.д. Для правядзення нацыянальнай самаацэнкі ў Беларусі ў кастрычніку створана каардынацыйная група, куды ўвайшлі прадстаўнікі ўсіх зацікаўленых структур, узначаліў яе намеснік міністра энергетыкі Міхаіл Міхадзюк. Галоўная мэта — выявіць «вузкія» месцы па азначаных 19 кірунках і распрацаваць мерапрыемствы для іх пераадолення.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

# «ДОБРААХВОТНІКАМ» НЕ ПАГРАЖАЕ КРЫМІНАЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

**У пачатку лістапада МУС Беларусі правядзе аператыўна-прафілактычныя мерапрыемствы «Арсенал». Іх асноўная мэта — папярэдзіць незаконны абарот зброі, боепрыпасаў, выбуховых прыстасаванняў і рэчываў.**

На працягу пяці дзён супрацоўнікі міліцыі не толькі зоймуцца выяўленнем людзей, якія трымаюць у сябе зброю без адпаведнага дазволу, але і наведаюць законных уладальнікаў агнястрэльных прадметаў, каб праверыць месцы іх захоўвання. Ва ўладальнікаў зброі, якія затрымліваліся за парушэнне грамадскага парадку, яе канфіскуюць. Падчас сумесных з работнікамі прыродаахоўных арганізацый рэйдаў не застануцца без увагі і браканьеры.

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, сёлета за 9 месяцаў на тэрыторыі краіны канфіскавана 773 адзінкі незарэгістраванай зброі, а таксама больш за 14 тысяч боепрыпасаў рознага калібру. Звыш 48 тысяч боепрыпасаў і 800 адзінак зброі грамадзяне здалі дабравольна.

Нагадаем, што за незаконныя дзеянні ў дачыненні да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў заканадаўствам прадугледжана пакаранне ажно да пазбаўлення волі тэрмінам на 12 гадоў з канфіскацыяй маёмасці. Людзі, якія добраахвотна здалі вышэйпералічаныя небяспечныя прадметы ў органы ўнутраных спраў, ад крымінальнай адказнасці вызваляюцца.

**Надзея ДРЫЛА.**

## БРАКАНЬЕРЫ ЗДАБЫВАЛІ ЛЯШЧОЎ У ЦЯЦЕРЫНЕ

Крымінальная справа распачата супраць двух жыхароў райцэнтра Круглае, якіх затрымалі 27 кастрычніка ўвечары каля Цяцерынскага вадасховішча. Нягледзячы на схаваны ў лесе аўтамабіль і вартавога сабаку парушальнікаў, супрацоўнікі інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету канфіскавалі ў браканьераў 3 сеткі з лескі і 19 кілаграмаў ляшчоў і акунёў. Рыба каштуе больш за 2,5 мільёна рублёў, а гэта ўрон у буйным памеры. Браканьерам, калі іх віна ў судзе будзе даказана, пагражае да 3 гадоў пазбаўлення волі.

Увогуле ў Магілёўскай вобласці ад пачатку года распачата 65 крымінальных спраў у дачыненні да браканьераў.

**Алена КАЗЛОВА.**

## Бяседныя песні. Рыжая восень

**Бяседа як вясёлая, а часам задушэўная размова нязмушана ўпарадкоўваецца добрым напоем. І як бы напружана ці гулліва ні вёўся бяседны рэй, заўсёды выпадае хвіліна-другая для песні. А ў ёй — і працяг гутаркі, і шлях да суладнасці, паразумення. Песня «Рыжая восень» Алены Аўрынскай і Ігара Лучанка нараджае прыемную мройнасць на застоллі. Вальсавая мелодыя акрыляе бяседнікаў, а акварэльныя фарбы навакольных краявідаў, па-майстэрску створаных паэткай, узнаўляюць у памяці жыццёвы кругабег і шчымлівыя адмеціны ў ім — майскія парыванні і вогненна-тэмпераментныя восеньскі одум.**

Верш Алены Аўрынскай — Музыка Ігара Лучанка

*Рыжая восень ходзіць між сосен,*
*Дорыць каралі рабінам.*
*Рыжая восень сыпле з нябёсаў*
*Шэрым пяром жураўліным.*

*Дзе тыя словы, вечар маёвы,*
*Што паміж намі пралеглі?*
*Дзе тыя ножкі, сцежкі-дарожкі,*
*Што ў маладосці прабеглі?*

*Дзе ж тыя ножкі, сцежкі-дарожкі,*
*Што ў маладосці, што ў маладосці,*
*Што ў маладосці прабеглі?*

*Рыжая восень. Возера просінь*
*Стыне празрыстай ільдзінкай.*
*Рыжая восень выстудзіць росы*
*І адляціць павуцінкай.*

*Дзе ж тыя песні, клён напрадвесні*
*З сокам салодкім на вуснах?*

*Дзе тыя словы, вечар маёвы?*
*Не пазавеш, не аукнеш...*

*Дзе тыя словы, вечар маёвы?*
*Не пазавеш ты, не пазавеш ты,*
*Не пазавеш, не аукнеш...*

*Рыжая восень доччыны косы*
*Спелым калоссем гайдае.*
*Рыжая восень, носік курносы,*
*Вочы — вясна маладая.*

*І пра каханне ёй на спатканні*
*З хлопцам харошым шаптацца...*
*Не сплю да рання, аж да світання —*
*Зноўку мне сёння сямнаццаць...*

*Не сплю да рання,*
*аж да світання —*
*Зноўку мне сёння, зноўку мне сёння,*
*Зноўку мне сёння сямнаццаць.*

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**

## Дзве даты. 31 кастрычніка

**1917 год** — у Мінску адкрыўся з'езд воінаў-беларусаў Заходняга фронту: удзельнічалі прадстаўнікі Паўночнага і Румынскага франтоў, Балтыйскага флоту. З'езд выказаўся за аўтаномію Беларусі, за адкрыццё ўніверсітэта і іншых ВНУ, стварыў Часовы выканаўчы камітэт Цэнтральнай беларускай вайсковай рады (старшыня С.А. Рак-Міхайлаўскі).



**1517 год** — Марцін Лютэр у Вітэнбергу (Германія) абвясціў 95 тэзісаў з нагоды рэфармавання вучэння і арганізацыі хрысціянскай царквы. Пачатак Рэфармацыі ў Еўропе. З сярэдзіны XVI стагоддзя новая плынь стала шырока распаўсюджвацца і па Беларусі.

## Цытата дня

***«Я гляджу на сябе як на дзіця, якое радуецца, што, гуляючы на марскім беразе, знайшло некалькі каменьчыкаў прыгожых і ракавін незвычайных — у той час як бязмежны акіян ісціны рассцілаўся перад маімі вачыма абсалютна недаследаваным».***

**Ісак Ньютан (1643—1727), англійскі матэматык, механік, астраном і фізік.**

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

# Шалям час ажыццяўляць славалюбівыя задумы, а Скарпіёнам рыхтавацца да важных і цікавых сустрэч

**АВЕН.** Нават калі ў вас вельмі шмат працы, не варта грэбаваць стасункамі з новымі людзьмі. Знаёмствы, набытыя на гэтым тыдні, саслужаць неблагую службу пасля, калі вы ўжо забудзецеся, пры якіх акалічнасцях яны адбыліся. У пачатку тыдня не трэба актыўна праяўляць ініцыятыву: пачакайце, пакуль вас папытаюць, тады і разгарніцеся ва ўсім сваім бляску. У сярэдзіне тыдня вас будуць то пераацэньваць, то недаацэньваць, у выніку чаго можа з'явіцца шмат працы і сапсавацца настрой.

**ЦЯЛЕЦ.** Пабудова прыгожых паветраных замкаў — гэта выдатна, але ўсё ж лепш рэальна ацаніць сітуацыю. Калі не захочаце праявіць творчы падыход і ініцыятыву ў працы, вас усё адно прымусяць працаваць, але ўмовы будуць невыгодна адрозніваецца ад ранейшых. Выкарыстайце свае лепшыя бакі як асобы, зачаруйце начальства сваёй мудрасцю — і ўсё будзе ў парадку.

**БЛІЗНЯТЫ.** Тыдзень можа прынесці шмат цікавых магчымасцяў. У панядзелак і аўторак пажадана пачаць важныя справы разам з зацікаўленымі ў поспеху людзьмі. У чацвер ілюзіі могуць сказіць ваша ўспрыманне навакольнага асяроддзя, таму, верагодна, з'явіцца незадаволенасць сабой, сваім партнёрам і наогул асабістым жыццём. Не дазваляйце гэтаму пачуццю верхаводзіць.

**РАК.** Правільныя рашэнні зможаце знайсці выключна дзякуючы інтуіцыі. Адносіны з навакольнымі хутка наладзяцца ў аўторак, калі прыміце некаторыя недахопы гэтых людзей. Вас перапоўняць новыя ідэі, і, пачынаючы з серады, вы зоймецеся складаннем планаў на найбліжэйшую будучыню. Аднак занадта далёка наперад лепш не планаваць. Ранейшыя цяжкасці адступяць і шлях будзе вольны. Ідучы на саступкі ў нядзелю, больш набудзеце, чым страціце.

**ЛЕЎ.** Падзеі тыдня будуць спрыяць большасці вашых пачынанняў. Аднак у выпадку асобных няўдач не варта адчайвацца — гэтая толькі часовая з'ява. Аўторак будзе досыць напружаным і насычаным падзеямі, асабліва на працы. Гэты дзень можа ўнесці нечаканыя карэктывы ў планы, але ўсё толькі да лепшага. У чым менавіта будзе гэта лепшае, зразумееце ў сераду. А ў пятніцу смела бярыцеся за самыя цяжкія справы, але не спяшайцеся з адзнакамі і каментарыямі.

**ДЗЕВА.** Пажадана не спяшацца, прытрымлівацца вызначаных правілаў і імкнуцца ўціхамірваць супярэчлівыя ўнутраныя парывы. У пачатку тыдня магчымыя праблемы з начальствам — на працы ў вас можа з'явіцца супернік або нядобразычлівец. Будзьце больш акуратнымі і прадбачлівымі, інакш вашы пазіцыі могуць пахіснуцца. У чацвер паспрабуйце не ўпірацца і перагледзьце некаторыя свае прынцыпы. Выхадныя дні могуць прымусіць вас пахваляваць, але хваляванні гэтыя будуць, хутчэй за ўсё, прыемнымі.

**ШАЛІ.** І на працы, і дома спадарыня Фартуна будзе на вашым баку. Так што пачынайце ажыццяўляць свае славалюбівыя задумы. Магчымае шматабяцальнае знаёмства. Паспрабуйце яго не празяваць. Ад вашых крокаў будуць залежаць змены ў прафесійнай дзейнасці. Пытанне толькі — у які бок, у горшы або ў лепшы. Не ўзвальвайце на сябе занадта вялікі аб'ём працы і, па магчымасці, не давайце абяцанняў — вам будзе пасля цяжка іх выконваць.

**СКАРПІЁН.** У першую палову тыдня давядзецца добрасумленна папрацаваць, выконваючы пастаўленыя перад сабой задачы. У панядзелак з'явяцца далягляды, якія зменяць вашы планы ў бок паляпшэння і дазволяць дамагчыся добразычлівасці начальства. Пятніца можа пацешыць цікавымі і важнымі сустрэчамі.

**СТРАЛЕЦ.** Часам будзе нялёгка спраўляцца са сваімі жаданнямі. У кар'еры і бізнэсе чакае відавочнае паляпшэнне: можа быць, павышэнне ў пасадзе. З'явяцца новыя мэты і задачы. Тыдзень будзе спрыяць рэалізацыі раней задуманых планаў. Адчуеце прыліў энергіі і сілаў.

**КАЗЯРОГ.** Нейкая мітусня, звязаная з выключна прыемнымі падзеямі, перакрэсліць усе сумныя планы і захопіць у казачны мір фантазіі. Калі пры гэтым не застанецца сілаў ні на што іншае, папрасіце дапамогі ў блізкіх. Паспрабуйце напоўніць сваю хату цеплынёй клопату аб блізкіх людзях, каб вам было цёпла і ўтульна разам з імі.

**ВАДАЛЕЙ.** Не варта спяшацца: спроба пераадолець перашкоду з наскоку можа прывесці толькі да траўмаў — як фізічных, так і маральных. Вельмі значную ролю будуць адыгрываць адносіны начальнік-падначалены. У панядзелак і аўторак непажадана пачынаць нешта новае або значнае. Абмяжуйцеся дробнымі справамі і паспрабуйце пазбегнуць непрыемных сустрэч.

**РЫБЫ.** Тыдзень можа быць звязаны з неабходнасцю перамяшчэння на значныя адлегласці. Пашырыцца ваш круг стасункаў. Вялікае значэнне можа мець вучоба і набыццё разнастайных навыкаў. У сераду, калі не хочаце стаць ахвярай падману, будзьце больш уважлівымі, не прымайце важных рашэнняў. Другая палова тыдня хутка прамчыцца за працоўнымі справамі і сямейнымі клопатамі.

# У ТАЙНІКУ — ЦЫГАРЭТЫ

**Прадстаўнікі адразу некалькіх ведамстваў затрымлівалі ўсяго толькі аднаго кантрабандыста.**

Ноччу супрацоўнікі полацкай мытні сумесна з браслаўскімі міліцыянерамі і супрацоўнікамі падатковай інспекцыі, а таксама памежнікамі затрымалі на пункце мытнага афармлення ля вёскі Урбаны Браслаўскага раёна «Фальксваген-Пасат». У ім 32-гадовы грамадзянін Латвіі ў спецыяльна абсталяваным тайніку перавозіў болей за 600 пачкаў цыгарэт агульным коштам болей за 1,4 мільёна беларускіх рублёў. Адпаведныя дакументы на нікацінавыя вырабы адсутнічалі.

Аўтамабіль і кантрабандны тытунь канфіскаваныя. Складзены адміністрацыйныя пратаколы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

### ПРЫРОДНАЯ АПТЭКА

## Тры асілкі



**Апошнім часам мы ўсё часцей чуем прыказку: «Адно лечым, другое калечым». Бяда ў тым, што з'явілася шмат лекаў са шкоднымі пабочнымі дзеяннямі, і асабліва небяспечныя антыбіётыкі. Аднак не варта глытаць таблеткі жменямі пры любой прастудзе! Давайце лепш успомнім пра тое, што ў прыродзе ёсць натуральныя раслінныя антыбіётыкі. Сярод іх тры ўсім добра вядомыя агародныя расліны: цыбуля, часнок і хрэн. Гэта самыя моцныя лекі ад многіх хваробаў.**

#### КАРЫСЦЬ ЦІ ШКОДА

Яшчэ з дзяцінства мы ведаем, што прычына большасці захворванняў — мікробы. На шчасце, далёка ў мінулым засталіся тыя часы, калі ад эпідэмій гінулі цэлыя гарады. Чалавецтва вынайшла антыбіётыкі. Здавалася б, гэта стала доўгачаканай панацэяй ад шкодных бактэрый. І сапраўды, лекавыя ўласцівасці антыбіётыкаў бясспрэчныя, іншы раз без іх не абысціся. Аднак колькі шкоды яны прыносяць нашаму арганізму! Гэта і аслабленне імунітэту, і алергія, і дысбактэрыёз. Прычына ў тым, што разам з узбуджальнікамі інфекцый антыбіётыкі знішчаюць і карысную флору. Але гэтага можна пазбегнуць, калі на дапамогу паклікаць матухну прыроду і яе раслінныя антыбіётыкі.

Расліннымі антыбіётыкамі называюць расліны (у першую чаргу цыбулю, часнок, хрэн, рэдзьку, лімон), якія змяшчаюць лятучыя рэчывы фітанцыды. Гэта нават не адно рэчыва, а цэлы комплекс злучэнняў, якія забяспечваюць імунітэт самой расліне. У іх ёсць шэраг пераваг перад медыкаментамі. Па-першае, іх уздзеянне накіраванае не толькі на барацьбу з мікробамі, але і на падтрыманне імунітэту ў цэлым. Па-другое, гінуць шкодныя мікраарганізмы ад раслінных антыбіётыкаў вельмі хутка, і яшчэ адзін «плюс»: да лякарстваў хваробатворныя мікробы праз нейкі час прыстасоўваюцца, а вось «хатнія лекары» працягваюць дзейнічаць гэтак жа, як і сто гадоў таму.

І яшчэ адна перавага. Напрыклад, пры грыпе аптэчныя антыбіётыкі могуць толькі нашкодзіць арганізму. Супраць вірусаў яны бяссільныя. А раслінныя ратуюць і ад бактэрый, і ад вірусаў. Іх выкарыстоўваюць пры прастудах, ангіне, захворваннях дзяснаў і зубоў, гнайнічках на скуры. Пры бронхалёгачных захворваннях добра дзейнічаюць і інгаляцыі з эфірным алеем гэтых раслін.

#### НАРОДНЫЯ РЭЦЭПТЫ

- **Пры насмарку** заліце дробна пасечаныя цыбулю і часнок такой жа колькасцю кіпеню, дайце настояцца ноч. Працадзіце, развядзіце нерафінаваным алеем, дадайце свежавыціснуты сок альясу ці каланхоэ (2-3 кроплі на 50 г сумесі). Кроплі ў нос гатовыя.
- **Ад насмарку** таксама добра ўдыхаць фітанцыды цыбулі ці часнаку праз носік фарфоравага чайніка.
- **Каб пачысціць ваду**, дастаткова пакласці ў яе на дзесяць хвілін карэньчык хрэну.
- Сок хрэну (1 частка) развядзіце вадой (5 частак), прымайце па 1 ст. лыжцы 3-4 разы на дзень як **мачагонны і адхарквальны сродак**, выкарыстоўвайце для паласкання рота і горла пры стаматытах, ангіне, фарынгіце, зубным болі.
- **Ад кашлю** добра дапамагае дробна пасечаны ці перамолаты хрэн. Змяшайце яго пароўну з цукрам ці мёдам і прымайце 2-3 разы на дзень па сталовай лыжцы.
- **Калі запалілася горла**, рэкамендуецца такі рэцэпт: разатрыце ў аднародную масу 8 зубкоў часнаку, дадайце 8 ч. лыжак натуральнага віннага воцату і старанна перамяшайце сумесь. Пакіньце на ноч у халадзільніку. На наступны дзень дадайце 60 г падагрэтага мёду, лепш цёмнага, і зноў перамяшайце. Пакладзіце ў рот 2 ч. лыжкі сумесі і трымайце да поўнага раставання, потым павольна праглыніце маленькімі глыточкамі.

-2613-

### ВЫ ПРАСІЛІ РАСКАЗАЦЬ

## Як адмыць мікрахвалевую печ?

**Як вядома, у час прыгатавання страў у мікрахвалевай печы (калі не накрываць ежу накрыўкай) тлушч і іншыя вытворныя пад уздзеяннем тэмпературы распырскваюцца ва ўсе бакі. І застаецца або выціраць печ пасля кожнага прыгатавання — разагравання ежы (што робіць мінімальная колькасць людзей), або перыядычна адмываць ужо прысохлы тлушч. Як жа палегчыць гэту работу?**

- Адзін з выпрабаваных спосабаў заключаецца ў наступным: намажце застылы тлушч на сценках сродкам для чысткі і ўключыце печ хвілін на 5—10. Тлушч разагрэецца, а затым лёгка здымаецца мачалкай. Адна праблема — не выкарыстоўвайце хімічныя сродкі, якія моцна пахнуць, потым вельмі цяжка пазбавіцца ад гэтага паху пры рабоце ў рэжыме канвекцыі, бо мыйны сродак трапляе ў рашотку вентыляцыі і потым адтуль не вымываецца.
- Яшчэ адзін сродак — звычайная вада з лімонам. Вазьміце шклянку вады, дадайце лімонны сок, уключыце печ на разаграванне, каб вада выпарылася. Пара размякчае тлушч, і ён пасля гэтага лёгка выдаляецца любым прыдатным сродкам і губкай, а лімон надае прыемны пах.
- Выпускаюцца і спецыяльныя сродкі для догляду ЗВЧ.

Як бачыце, усё не так страшна, як здаецца спачатку. На будучыню такая парада: сёння можна набыць спецыяльныя пластыкавыя накрыўкі, якімі накрываюць стравы, каб пазбегнуць распырсквання тлушчу. Або проста працірайце печ мокрай анучкай пасля кожнага прыгатавання ежы. Гэта карысная звычка выратуе вас ад пакут у будучым, а зойме ўсяго некалькі хвілін.



### РУКАДЗЕЛЛЕ

## Уласны досвед

### У барацьбе за чысціню дапаможа малако

Вы здзівіцеся, але ў час уборкі кватэры можна выкарыстаць звычайнае малако.

Яно выдатна ачышчае бруд з многіх паверхняў, напрыклад, з люстэрка ці пластыку. Малако надае ім бляск. А калі ў доме ёсць карціны ў пазалочаных рамах, іх таксама добра праціраць анучкай, памочанай у малако.

#### ШМАТРАЗОВЫ ПЭНДЗЛІК ДЛЯ КЛЕЮ

Калі вашы дзеці любяць займацца аплікацыяй, ім спатрэбяцца пэндзлі для клею. Іх можна зрабіць самастойна. Прамыйце ацэтонам выкарыстаны стрыжань ад шарыкавай ручкі і ўцягніце капронавай ніткай складзены ўдвая кавалак капронавага шпагату. Цяпер падраўняйце шпагат нажніцамі — і пэндзлік гатовы. Яго хопіць надоўга — трэба толькі выцягваць і падразаць запэцканы канец.

#### ВЫДАЛЯЕМ ПАДПАЛІНЫ

Каб выдаліць падпаліны ад праса з белых рэчаў, змяшайце 2 ст. лыжкі перакісу вадароду з 1 ст. лыжкай нашатырнага спірту. Нанясіце атрыманы раствор на падпаленае месца і пакіньце на 20 хвілін.

#### ЯК ВЫБРАЦЬ ЛІМОНЫ?

Старайцеся набываць лімоны з тоўстай скурай. Вызначыць таўстаскурыя плады няцяжка: у іх паверхня няроўная, гузаватая. Аднак, калі заўважыце карычневыя ўпалыя кропачкі, то такія лімоны лепш не браць: гэтыя «воспінкі» — сігнал аб тым, што пры перавозцы ці захоўванні яны пераахаладзіліся і згубілі значную частку сваіх смакавых і карысных уласцівасцяў.

-2614-

# СІМВОЛІКА КОЛЕРУ

**Даследчыкі гісторыі традыцыйнай культуры беларускага народа прыйшлі да высновы, што архаічнымі, найбольш старажытнымі і разам з тым найбольш распаўсюджанымі колерамі беларусаў былі белы (шэры, колер адбеленага льну) і чырвоны (насычаны карычневы) колеры. У шэрагу рытуальных дзеянняў і рэчаў белы і чырвоны колеры дамінуюць ці з'яўляюцца сэнсавызначальнымі.**

- Нагадаем, што ў супрацьлеглым баку ад парога заўсёды быў ***«чырвоны»*** кут, па дыяганалі ад чырвонага кута ў хаце знаходзілася печ, якую абавязкова фарбавалі ў ***белы*** колер.
- У час першага рытуальнага купання дзіцяці, калі бабка-павітуха змывала сляды мацярынскага свету і «ўводзіла» дзіця ў свет сям'і, роду, яго спавівалі ў ***белае***, але пры гэтым зверху абавязкова перавязвалі ***чырвоным поясам-абярэгам***.
- Перад хрышчэннем дзіця апраналі ў новае (ці атрыманае ў спадчыну ад малодшага дзіцяці) ***белае адзенне*** (і толькі такое, а не так, як сёння: дзяўчынку ў ружовае, а хлопчыка — у блакітнае), а зверху зноў-такі павязвалі ***чырвоны пояс***.
- Імкнуліся, каб нацельны крыжык, які дадуць дзіцяці, быў на ***чырвонай*** нітцы.
- У народнай медыцыне наяўнасць рэчаў чырвонага колеру была складовай часткай пры лячэнні рожыстага запалення, спалохаў, сурокаў, рэўматызму і г.д. Абярэгамі хаты сталі чырвонае велікоднае яйка, галінка рабіны, сарваная 21 верасня. Самым надзейным абярэгам для чалавека з'яўляліся чырвоная нітка ці чырвоны пояс. Святым месцам у хаце быў «чырвоны» кут.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся!

**З дзённіка адной дзяўчынкі.**
**Гістарычка выклікала бацьку ў школу. Бацька прыйшоў дадому позна, п'яны і ўвесь у губной памадзе, крычаў на маці, што прыгоннае права адмянілі ў 1861 годзе.**

☺

Двое сяброў.
— Як там тваё сонейка?
— Масла мяняць трэба. Ці ты пра Іру?

☺

**— Софачка! Якое ў вас шыкоўнае калье! І дзе ж вам так пашчасціла?**
**— Вой, каб мне самой ведаць! Майго Сёму следчыя ўжо тры месяцы не могуць раскалоць...**

☺

У студэнта тры мары: 1. На лекцыі — «Калі ж я паем?» 2. На практыцы — «Калі ж я пасплю?» 3. У сесію — «Калі ж я памру?»

☺

**— Чым адрозніваюцца спартыўныя «Жыгулі» ад звычайных?**
**— У спартыўных каля задняга шкла ляжаць красоўкі!**



**У суд горада Жодзіна** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **АЛЬХОВА Андрэя Мікалаевіча**, 1 сакавіка 1971 года нараджэння, ураджэнца г.п. Плешчаніцы Лагойскага раёна Мінскай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства: вул. Калініна, д. 13, г.п. Плешчаніцы Лагойскага раёна Мінскай вобласці. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Альхова А.М., паведаміць іх суду г. Жодзіна Мінскай вобласці (г. Жодзіна, вул. Брэсцкая, д. 5А, пак. № 5) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання абвесткі.

**У суд горада Жодзіна** паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **ПІЛЬЧУК Марыі Іванаўны**, 14 студзеня 1975 года нараджэння, ураджэнкі горада Жодзіна, апошняе вядомае месца жыхарства: пр. Міру, д. 16, кв. 29, г. Жодзіна Мінскай вобласці. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Пільчук М.І., паведаміць іх суду г. Жодзіна Мінскай вобласці (г. Жодзіна, вул. Брэсцкая, д. 5А, пак. № 5) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання абвесткі.

Публикацыю по утере печати СТ «Вышково» («Звязда» от 14.10.2009 г.) **считать недействительной**.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 5990. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12



Тут ствараюць элементы будучых пабудоў.

# УПЭЎНЕНЫ ШЛЯХ НАПЕРАД

## На Мар'інагорскім заводзе жалезабетонных вырабаў робяць апраўданую стаўку на перспектыўнае развіццё

**Бадай што, найбольш відавочным адлюстраваннем тых адметных працэсаў, якія адбываюцца ў айчыннай эканоміцы, з'яўляецца сапраўдны будаўнічы «бум». Прычым гэта датычыцца ўзвядзення не толькі жылых дамоў, а і самых разнастайных аб'ектаў сацыяльнай, культурнай сферы. З'яўляюцца прыгожыя адміністрацыйныя будынкі, дарогі, неабходная інфраструктура. Адбываецца маштабная рэканструкцыя, рамонт жылфонду і шмат якіх найважнейшых аб'ектаў. Зразумела, усё гэта было б немагчымым без належнага развіцця вытворчасці будаўнічых матэрыялаў. Таму наша наведванне Мар'інагорскага завода жалезабетонных вырабаў — гэта спроба ацаніць становішча ў галіне праз вывучэнне вопыту канкрэтнага прадпрыемства. Тым больш, што ў цяперашняй няпростай сітуацыі тут здолелі значна павялічыць аб'ёмы вытворчасці. Завод упэўнена адчувае сябе ў дні сённяшнім і вызначае становучую перспектыву на будучыню. Як гэта атрымліваецца?**



У цэху фармоўкі кольцаў.

**На пляцоўцы, дзе выстаўлена прадукцыя прадпрыемства, фотааб'ектыў убачыў дырэктара Аляксандра МІКУЛЬЧЫКА, начальніка вытворча-планавага аддзела Генадзя ПАШНІНА, галоўнага інжынера Сяргея МОТУЗА.**



### Выпрабаванне часам

Мар'інагорскі завод жалезабетонных вырабаў мае сваю насычаную падзеямі і працоўнымі здзяйсненнямі гісторыю. Прадпрыемства было створана ў 1967 годзе на базе падсобнага ўчастка міжкалгаснай будаўнічай арганізацыі. Пасля завод уваходзіў у склад аб'яднання «Мінаблміжкалгасбуд», а праз колькі гадоў пераўтварыўся ў Пухавіцкі сельскі будаўнічы камбінат. У 1980-я гады прадпрыемства ўвайшло ў склад Слуцкага СБК. Так працавалі да сярэдзіны 1990-х, калі па аб'ектыўных прычынах значна скараціліся аб'ёмы вытворчасці і, адпаведна, зменшыўся працоўны калектыў. Цяперашні кіраўнік Мар'інагорскага завода жалезабетонных вырабаў Аляксандр Мікульчык добра памятае тыя складаныя часы. Ён прыйшоў працаваць на прадпрыемства амаль сорак гадоў таму — у 1970-м. Адказны і добрасумленны спецыяліст, які прайшоў усе прыступкі прафесійнага майстэрства ў сваёй справе. Таму ўвесь вытворчы працэс ведае дасканала, да дробязяў. З 1994 года Аляксандр Мікульчык працуе на пасадзе дырэктара Мар'інагорскага завода жалезабетонных вырабаў.

— Калі ўзначаліў прадпрыемства, былі надзвычай складаныя часы, — узгадвае Аляксандр Уладзіміравіч. — Заказаў практычна не было, даводзілася ў прамым сэнсе перабівацца выпадковымі заробкамі, каб захаваць прадпрыемства, вытворчую базу. І такі разлік сябе апраўдаў. Пэўны час таму завод увайшоў у склад вытворчага аб'яднання «Мінскаблсельбуд». З прыходам цяперашняга кіраўніка аб'яднання Васіля Іванавіча Рыбака сітуацыя пачала змяняцца да лепшага. У апошнія гады адзначаецца сапраўдны ўздым, павялічваюцца вытворчыя паказчыкі.

### Стратэгічная задача

Мар'інагорскаму заводу жалезабетонных вырабаў удалося амаль немагчымае: пачынаючы з 2007 года тут у чатыры разы (!) узраслі аб'ёмы вытворчасці. У чым жа сакрэт такога поспеху? Як высветлілася, нічога звышнатуральнага на заводзе не выдумлялі. Як перакананы Аляксандр Мікульчык, такому росту значна паспрыяла дзяржаўная падтрымка. Мар'інагорскі завод жалезабетонных вырабаў бярэ самы актыўны ўдзел у выкананні шэрагу найважнейшых дзяржпраграм. У прыватнасці, па будаўніцтве жылля. Апошнім часам Мінская вобласць значна павялічыла аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва. Свая заслуга ў гэтым рыўку належыць і заводу.

— Міншчына з'яўляецца адным з лідараў па аб'ёмах будаўніцтва жылля сярод іншых рэгіёнаў, — адзначае Аляксандр Мікульчык. — Летась толькі ў вёсцы было здадзена ў эксплуатацыю 876 дамоў, з якіх 371 будынак узведзены аб'яднаннем «Мінскаблсельбуд». Можна падлічыць, колькі людзей палепшылі свае жыллёвыя ўмовы. Тэмпы росту заўважныя, а налета запланавана падвоіць адпаведны паказчык. Так што задачы самыя сур'ёзныя, і мы заўсёды адчуваем сваю адказнасць у тым, каб яны былі належным чынам выкананы.

Зразумела, для таго, каб выйсці на запланаваныя аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва, неабходна забяспечыць адпаведную колькасць камплектавых вырабаў. Таму Мар'інагорскі завод атрымаў сапраўдны шанц на будучыню. Зразумела, важна было тое, як скарыстаецца прадпрыемства такой спрыяльнай сітуацыяй. Мяркуючы па вытворчых паказчыках, справы пайшлі як мае быць. Сёлета будзе выпушчана 20 тысяч куб. метраў зборнага жалезабетону.



Галоўны энергетык Уладзімір РЫЛІК, слесары Генадзь СТАРЦАЎ і Васіль ЗНАК.

Завод дасягнуў аб'ёмаў 1990 года, узровень якога ўвесь час прыводзіўся як паказальны. У найбліжэйшай перспектыве адпаведныя паказчыкі тут мяркуюць нават перавысіць.

### Усё для людзей

Прадпрыемства забяспечвае неабходнымі будаўнічымі матэрыяламі ўзвядзенне жылля не толькі на вёсцы, а і ў гарадах, дзе будынкі здаюцца ў складзе ЖБК. Таму сцвярджэнне «праца для людзей» да работнікаў Мар'інагорскага завода жалезабетонных вырабаў мае самае прамое дачыненне. Усе яны ўдзельнічаюць у тым, каб стварыць утульнае, камфартабельнае жыллё.

— Паляпшэнне якасці прадукцыі, якую выпускае прадпрыемства, — адна з асноўных задач, — перакананы Аляксандр Мікульчык. — Цяпер мы зрабілі такую вытворчую базу, якая стварае належныя ўмовы для перспектыўнага развіцця. Абнаўляецца абсталяванне, закупляецца тэхніка. Таму ёсць упэўненасць у будучыні. Неабходна пастаянна рухацца наперад. Людзі гэта разумеюць. Праўда, існуюць і пэўныя цяжкасці. Сярод такіх надзённых пытанняў — будаўніцтва ўласнай кацельні на прыродным газе. Гэта дазволіць не толькі павялічыць аб'ёмы вытворчасці, але і палепшыць якасць, эканамічныя паказчыкі. Сутнасць у тым, што нас зусім не задавальняе той кошт, па якім мы цяпер атрымліваем цяпло ад ЖКГ.

У стадыі вырашэння — пытанне аб выдзяленні беспрацэнтнай пазыкі на стварэнне дадатковых працоўных месцаў. Гэтыя сродкі плануецца выдаткаваць на закупку новага абсталявання, што дазволіць павялічыць аб'ёмы вытворчасці таварных сумесяў, на якія цяпер існуе значны попыт.

На Мар'інагорскім заводзе жалезабетонных вырабаў працуе цяпер амаль паўтары сотні чалавек. Гэта ўдвая больш, чым было ў постсавецкія часы. Як згадвалася вышэй, калектыў яшчэ павялічыцца. На заводзе шмат тых, хто працуе тут не адзін дзясятак гадоў. З іншага боку, амаль палова калектыву — моладзь. Так што з працоўнай зменай усё ў парадку, а маладым спецыялістам заўсёды ёсць у каго павучыцца, атрымаць карысную параду. Трапіць на завод імкнуцца многія — прываблівае ўзровень заробкаў, а таксама сацыяльныя гарантыі, якія маюць работнікі. Не менш важны момант — добразычлівыя, уважлівыя адносіны ў калектыве. Гэта сапраўдная каманда прафесіяналаў, якім па сілах самыя адказныя задачы. Каб і надалей працягнуць свой упэўнены шлях наперад. Дарэчы, у тым, што ўсё адбудзецца менавіта такім чынам, мы нікольки не сумняваемся.

**Захар БУРАК, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

УНП 690605902.

**На здымках (злева–направа): электразваршчык — адна з самых запатрабаваных прафесій. Сяргей ЧУГУНОЎ і Юры ОСЬМАЧКІН працуюць з аўтаматамі кропкавай зваркі.**

**Трываласць вырабаў уважліва правяраюць у лабараторыі ўпраўлення якасцю будаўнічай прадукцыі. Тут мы сфатаграфавалі загадчыка вытворчасці Аляксандра МЯРКУЛАВА і майстра АТК Вольгу ВАЛЫНЕЦ.**

**Фармоўшчыкі Іван БІРУК і Дзмітрый ПАРШЫНЦАЎ правяраюць дакладнасць заліўкі бетонам накрывак для кольцаў.**

**Калектыў прадпрыемства ганарыцца сваімі ветэранамі вытворчасці. Машыніст маставога крана Кацярына ЗІНІНА працуе тут больш за сорак гадоў.**

**На гэтым участку правяраецца дакладнасць нацяжкі арматуры.**











# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




### ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Сканворд (29 кастрычніка). Па гарызанталі:** Гарнастай. Ягня. Акот. Ная. Стог. Какос. Ліса. Чало. Аўт. Сумёт. Андатра. Бок. Таз. Спад. Вавёрка. Долар. Пясец. Парк. Оптыка. Гана. Сакс. Шакал. Аніс. Прараб. Кадр. Пачатак. Андарак. **Па вертыкалі:** Праполка. Вада. Асада. Ворс. Ёлка. Атбара. Кропка. Таўро. Крос. Гляк. Такса. Атака. Гонг. Тын. Рак. Рэнта. Ірад. Яга. Укос. Бра. Космас. Пляга. Камета. Сак. Адмена. Дэфіс. Туз. Цалінік.

# ПАГАРЭЛЬЦАЎ ВЫРАТАВАЛІ ПРАЗ АКНО

**Два чалавекі былі выратаваны на пажары, што здарыўся ў вёсцы Сеніца Мінскага раёна. Ён распачаўся ў двухпавярховым доме на дзве сям'і ў пакоі на першым паверсе.**

— Па папярэдніх звестках, віноўніцай пажару стала шасцігадовая ўнучка гаспадара дома. Пакуль яе маці знаходзілася на кухні, дзяўчынка заставалася ў пакоі адна. Не сказаўшы пра здарэнне ні слова, дзіця прыйшло да маці. А праз некаторы час жанчына адчула моцны пах дыму, — паведаміла рэдакцыі прэс-сакратар Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Настасся Клебан.

Утаймаваць полымя самастойна ў маці не атрымалася. Таму, выклікаўшы падраздзяленні МНС, яна адвяла дачку да суседзяў, а сама ўзнялася на другі паверх дома, дзе знаходзіўся брат мужа — інвалід першай групы. Спусціцца ўніз у іх не атрымалася, бо шлях перагарадзіў дым. Выратавальнікі эвакуявалі пагарэльцаў праз акно пры дапамозе лесвіцы. Жанчына з невялікімі апёкамі рук і атручэннем прадуктамі гарэння дастаўлена ў бальніцу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**




альбо На пампушкі да Алены

**СЁННЯ, паважаныя нашы чытачы, будзем пячы пірагі. Безумоўна, пірагі — гэта не вельмі карысна, але вельмі смачна! Не заклікаю вас гатаваць іх кожны дзень, але часам не проста можна, а нават неабходна сябе папесціць! Каб не лаяліся прыхільнікі здаровага харчавання — даю рэцэпт вельмі карыснага і лёгкага супу. Смачна есці! І каб абмежавацца адным кавалкам пірага, памятайце народную мудрасць: булачка (як і ўсё печанае) — гэта 2 хвіліны задавальнення, 3 гадзіны ў страўніку і ўсё жыццё на клубах!**

### СУПЧЫК З ПРОСА З ЧАСНАЧКОМ

*Вазьміце:* *паўшклянкі проса, 1,5 літра вады, 1-2 цыбуліны, 1 морквіну, соль, перац, 3 долькі часнаку, зяленіва.*

Проса перабраць, прамыць, заліць вадой і варыць да мяккасці (не забудзьце пасаліць). Цыбулю дробна парэзаць. Моркву надзерці на буйной тарцы. Пасіраваць цыбулю з морквай і дадаць у каструлю да проса. Варыць суп яшчэ каля 5 хвілін, затым дадаць прапушчаны праз прэс часнок, дасаліць на смак, паперчыць, пакласці дробна парэзанае зяленіва, выключыць і даць настояцца пад накрыўкай 5 хвілін.

### КУРЫНЫ ПІРОГ «РОССЫП»

Вельмі незвычайны і смачны пірог. Цеста не проста рассыпістае, яно сыпкае.

*Нам спатрэбіцца:*

*Для цеста:* *150 г сметанковага масла, 1/3 чайнай лыжкі солі, 1,5 шклянкі мукі, 1 чайная лыжка разрыхляльніка.* *Для начынкі:* *курыныя грудкі (500 г), 2 цыбуліны, 1 чайная лыжка гатовай гарчыцы, 100 г смятаны, 3 яйкі, 1/2 чайнай лыжкі солі, перац.*

Цыбулю дробна парэзаць. У патэльню наліць алею і выкласці цыбулю. Смажыць, перыядычна памешваючы, да таго часу, пакуль цыбуля не пачне крыху ружавець, у той жа час, застаючыся сакавітай. Зняць патэльню з агню. Пакуль смажыцца цыбуля, падрыхтаваць курыцу. З грудак зняць скуру і выразаць косць. Парэзаць філе маленькімі кубікамі. Пакласці ў глыбокую міску і туды ж выкласці смятану і гарчыцу, усё пасаліць і паперчыць. Перамяшаць і пакінуць хвілін на 15. Цяпер гатуем цеста. Сметанковае масла трэба давесці да пакаёвай тэмпературы (толькі не растопліваць!). У масла ўсыпаць соль і разрыхляльнік. Узбіць міксерам. Насыпаць муку і добра перамяшаць (можна міксерам). Павінны атрымацца дробныя тлустыя крошкі. Дапушчальныя і буйныя крошкі. На дно формы для запякання пакласці кружок паперы. Насыпаць 3/4 цеста. Разраўняць і зрабіць невялікія борцікі. Цеста не прымінаць. У міску з курыцай пакласці абсмажаную цыбулю і яйкі і перамяшаць. (Пажадана яйкі ўзбіць міксерам асобна, а потым ужо змяшаць з курыцай.) Начынку выкласці ў форму. Зверху насыпаць астатняе цеста. Паставіць форму ў папярэдне разагрэтую да 180—200 °С духоўку на 30—40 хвілін — да яркага зарумяньвання паверхні. Гатовы пірог дастаць з формы пасля таго, як астыне, проста перавярнуўшы форму.

### СЛОЕНЫ ЯБЛЫЧНА-ГРУШАВЫ ПІРОГ

Так, слоенае цеста можна прыгатаваць і самім, але з пакупным атрымаецца хутчэй і таксама вельмі смачна!

*Для пірага памерам дзесяці 30х20 см вазьміце:* *1 упакоўку слоенага цеста (500 г), 1-2 яблыкі, 1 грушу, 1 сталовую лыжку ачышчанага міндалю (калі ёсць), 1 сталовую лыжку каньяку (таксама, калі ёсць), 2 сталовыя лыжкі цукру і яшчэ крыху для пасыпання пірага, яйка для змазвання.*

Слоенае цеста выкласці на злёгку пасыпаную мукой рабочую паверхню (калі цеста замарожанае, папярэдне размарозіць яго) і раскачаць у 2 прамавугольныя пласты. Адзін пласт выкласці на крыху змочаную халоднай вадой бляху, накрыць харчовай плёнкай і паставіць у халадзільнік. Другі пласт акуратна скласці ўздоўж папалам і вострым нажом зрабіць дыяганальныя або вертыкальныя надрэзы, адступіўшы ад краёў каля 4-5 см і робячы надрэзы на адлегласці 2-3 см адзін ад аднаго. Затым надрэзанае цеста акуратна разгарнуць, накрыць харчовай плёнкай і таксама паставіць у халадзільнік. Яблыкі і грушу вымыць (калі скурка грубая, можна абабраць). Выдаліць у садавіне асяродак з насеннем і нарэзаць яе тонкімі скрылікамі. Спырснуць іх каньяком і перамяшаць. Ачышчаны міндаль здрабніць у блендары. Бляху з цестам (без надрэзаў) дастаць з халадзільніка і выкласці на цеста скрылікі грушы і яблыкаў, адступіўшы ад краёў 1—1,5 см. Садавіну пасыпаць молатым міндалем і цукрам. Краі цеста злёгку змазаць яечным бялком або яйкам, зверху акуратна пакласці цеста з надрэзамі і прыціснуць краі. Бляху з пірагом зноў паставіць у халадзільнік на 10—15 хвілін. Перад выпяканнем змазаць паверхню пірага яечным жаўтком або яйкам (толькі не змазвайце бакі, інакш гэта будзе перашкаджаць цесту падымацца) і пасыпаць цукрам. Паставіць пірог у папярэдне нагрэтую да 220 °С духоўку і выпякаць 25 хвілін да зарумяньвання. Пірог дастаць з духоўкі, даць крыху астыць і можна падаваць на стол.

### Ядомы анекдот

**На званым абедзе адзін з гасцей звяртаецца да суседа па стале:**

**— Між намі кажучы, булён вельмі вадкі і празрысты, як вада.**

**— Інакш мы б не ўбачылі ўзору на талерках, а гаспадыня заплаціла за сервіз вялізныя грошы.**

* * *

Каля вінна-гарэлачнай крамы ляжыць мужчына.

— Вы п'яны або з вамі штосьці здарылася? — пытаецца міліцыянер.

— Ні першае, ні другое. Я тут у рэкламных мэтах.

ПаWWWуцінне ад Вікторыі ЗАХАРАВАЙ

# ICQ «загаварыла» па-беларуску

**КАМПАНІЯ ICQ LLc сумесна з Bigmir.net выпусціла афіцыйны кліент папулярнага інтэрнэт-пэйджара ICQ 6.5. на беларускай мове.**

Як расказаў дырэктар кампаніі «Мір-Інтэрнэт» Іван Монцік, у якасным беларускім перакладзе ўсяго інтэрфейсу, ад усталявання праграмы да ўнутраных сэрвісаў, вялікую дапамогу аказала каманда сацыяльнай сеткі Belarusy.by. «Паверце, з першай старонкі ўсталявання вы будзеце прыемна здзіўленыя і не захочаце пераходзіць на іншы кліент», — запэўніў ён карыстальнікаў. Знайсці беларускую версію ICQ 6.5 можна як на афіцыйным сайце кампаніі www.icq.com, выбраўшы для ўсталявання мову — «беларуская», так і на асобнай старонцы icq.bigmir.net/by. Між іншым, першая афіцыйная беларуская версія ICQ была выпушчана ў снежні 2008 года. На сёння ж аўдыторыя яе карыстальнікаў штомесяц складае каля 350 тысяч чалавек. Увогуле ў свеце, па прыблізных ацэнках экспертаў, службай імгненнага абмену паведамленнямі ICQ сёння актыўна карыстаюцца каля 15 мільёнаў чалавек, а зарэгістраваныя ўліковыя запісы маюць каля 400 мільёнаў.




## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.08 | 16.38 | 9.30 |
| Віцебск — | 7.01 | 16.24 | 9.23 |
| Магілёў — | 6.58 | 16.28 | 9.30 |
| Гомель — | 6.51 | 16.29 | 9.38 |
| Гродна — | 7.22 | 16.54 | 9.32 |
| Брэст — | 7.18 | 16.58 | 9.40 |

### Месяц

***Поўня 2 лістапада. Месяц у сузор'і Авена.***

### Імяніны

***Пр.*** *Златы, Андрэя, Іосіфа, Сяргея, Юльяна.*

***К.*** *Антаніны, Лукі, Сатурніна, Урбана.*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.




# СЯРПОМ ПА... ЯГАДЗІЦАХ

**Спрэчкай з пагрозамі зарэзаць сярпом закончылася звычайная папойка 44-гадовага раней судзімага жыхара вёскі Забалоцце Бабруйскага раёна і яго 32-гадовай знаёмай з вёскі Галееўка Гомельскага раёна.**

Спачатку яны добра выпілі разам каля вёскі Урыцкае, а на наступны дзень яна напісала заяву ў міліцыю пра тое, што грамадзянін нанёс ёй «колата-рэзанае раненне абедзвюх ягадзічных абласцей і ўдар мяккіх тканак галавы», — паведамляе прэс-служба УУС Гомельскага аблвыканкама. А ў Гомелі начная бойка паміж мужчынам і жанчынай закончылася тым, што раней судзімы 33-гадовы прадстаўнік моцнага полу добра парэзаў 23-гадовай прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва... вуха. Ну і твар таксама сапсаваў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**